

РЫХТУЙ ПЕЧ ЗАГАДЗЯ 5

СТРЫМАЦЬ ЭПІДПРАЦЭС 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ВЕРАСНЯ 2021 г. СЕРАДА № 187 (29556)

## КОРАТКА

• **Новы сезон праекта па асновах прадпрымальніцтва стартуе ў БДУ.**

• Работнікі аховы здароўя могуць звяртацца наконт выдачы сродкаў індывідуальнай аховы на гарачую лінію.

• **У «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» выйшла дзіцячая кніга пра свойскіх жывёл.**

• Служба занятасці летам працаўладкавала больш за 23 тысячы навучэнцаў.



з першых вуснаў

# «Уся работа па канстытуцыйным будаўніцтве стала асновай для кансалідацыі грамадства»



Фота БелТА.

### У Палацы Незалежнасці падвялі вынікі работы Канстытуцыйнай камісіі

**Пра тое, што сустрэча Прэзідэнта Беларусі з Канстытуцыйнай камісіяй адбудзецца на гэтым тыдні, стала вядома загадзя. На нарадзе з Саветам Міністраў у мінулы панядзелак Аляксандр Лукашэнка заявіў, што хоча ў хуткім часе абмеркаваць праект новага галоўнага дакумента краіны. Пасля разгляду змен з шырокім складам спецыяльнай камісіі створаць невялікую групу экспертаў, якая прафесійна будзе дапрацоўваць закон і рыхтаваць яго да рэферэндуму. Па словах Прэзідэнта, ён адбудзецца не пазней за люты наступнага года.**

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Днямі Прэзідэнт падпісаў указ, які прадугледжвае, што з 1 кастрычніка 2022 года ў краіне будзе ўведзена добраахвотнае страхаванне дадатковай назапашвальнай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы. Гэты дакумент — крок у развіцці пенсійнай сістэмы краіны. Пры фарміраванні падыходаў і прапаноў вывучаўся міжнародны вопыт, і мы ўзялі найбольш паспяховыя практыкі. На сённяшні момант гэта суфінансаванне: чалавек зацікаўлены, калі дзяржава падстаўляе плячо, удзельнічае нароўні з ім у назапашванні дадатковай пенсіі. Уклад памнажаецца ў два разы, назапашаная пенсія атрымліваецца большай, асабліва з улікам працоўнай».*

Пракаветнае

# БАГАЧ — СВЯТА СОНЦА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Гулянне, прымеркаванае да заканчэння збору ўраджаю і першага запальвання хатняга агню, якое раней спраўлялі нашыя продкі, правялі ў мінулыя выхадныя аматары беларускага фальклору. Свята прайшло ў знакамітай Вязынцы, каля хаты Песняра. Арганізатарамі былі філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і студэнцкае этнаграфічнае таварыства.**

СТАР. 13

Прэферэнцыі

# АДВАЖЫЦЦА І... ПАЧАЦЬ!

### Што стрымлівае развіццё «жаночага» бізнесу?



**Уклад суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў ВУП нашай краіны за 2020 год склаў 26,4 % — такую лічбу прывялі ў Нацыянальным статыстычным камітэце Беларусі. Уцягванне ў прадпрымальніцтва большай колькасці жанчын здольна стаць яшчэ адным стымулам для росту ў краіне малога і сярэдняга бізнесу, што station ўча адаб'ецца на эканоміцы краіны.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

21187>

# «Уся работа па канстытуцыйным будаўніцтве стала асновай для кансалідацыі грамадства»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Сваю работу Канстытуцыйная камісія пачала ў сакавіку. Яе задачы — не толькі распрацаваць прапановы па змене Канстытуцыі, але і забяспечыць іх усенароднае абмеркаванне. У склад Канстытуцыйнай камісіі ўвайшлі 36 чалавек. Гэта прадстаўнікі дзяржаўных органаў, юрыдычнай навукі, грамадскіх аб'яднанняў, розных галін эканомікі і сацыяльнай сферы. Кіраванне групай даручылі Старшыні Канстытуцыйнага Суда Пятру Міклашэвічу. Па выніках ён расказаў, што нявырашанымі засталіся толькі тры пытанні. Іх абмеркавалі з Прэзідэнтам: статус Усебеларускага народнага сходу, пытанне смяротнага пакарання і правы працоўных калектываў вылучаць кандыдатаў у дэпутаты.

## ЗАХАВАННЕ САЦЫЯЛЬНЫХ ГАРАНТЫЙ І ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

«Мінулі месяцы напружанай працы, вялікай працы, спрэчак, прэтэнзій адзін да аднаго. На наш заклік прыняць удзел у распрацоўцы новай рэдакцыі Асноўнага Закона адгукнулася вялікая колькасць людзей, у тым ліку грамадскія аб'яднанні. Гэта — аснова нашай перспектывы, нашага жыцця ў будучыні. Вам давялося дэталёва вывучыць усе прапановы і ініцыятывы, прааналізаваць сусветны вопыт дзяржаўнага будаўніцтва, вывучыць сучасныя тэндэнцыі развіцця канстытуцыйнага заканадаўства. Гэта, безумоўна, вялікая праца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падзякаваў усім членам камісіі за адказны падыход да справы і дадаў, што ўважліва сачыў за працэсам, слухаў выступленні ўдзельнікаў у сродках масавай інфармацыі.

Прэзідэнт канстатаваў, што ўжо ёсць варыянт праекта Асноўнага Закона краіны, а таксама адзначыў сістэмны характар прапанаваных змен. Бо яны ў сваю чаргу закранаюць практычна ўсе раздзелы Канстытуцыі: ад прэамбулы да заключных палажэнняў.

«***Папраўкі накіраваны на тое, каб зрабіць наш Асноўны Закон больш сучасным***. Адразу скажу, што мне імпануе ў прапанаваным праекце. Гэта, натуральна, не канчатковае меркаванне. Замацаванне ў Канстытуцыі каштоўнасных арыенціраў грамадства, у тым ліку захаванне гістарычнай праўды і памяці аб подзвігу беларускага народа, асабліва ў гады Вялікай Айчыннай вайны, на мой погляд, абсалютна правільна. Менавіта патрыятызм і гістарычная памяць робяць нас сапраўды адным народам, адзінай нацыяй», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, камісія слушна прапаноўвае пакінуць непарушнымі канстытуцыйныя прынцыпы, накіраваныя на забеспячэнне суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі, бо з імі мы адбыліся як нацыя, як суверэнная дзяржава, пра якую наш народ марыў тысячу гадоў.

«***Прапануецца ў Асноўным Законе захаваць пераемнасць сацыяльнай палітыкі дзяржавы і нават прыкметна павысіць узровень сацыяльнай абароненасці грамадзян***. З гэтым я згодны. Гэта адпавядае дзяржаўнаму курсу, які падтрымлівае большасць грамадзян краіны. Тут ёсць небяспечнасць скаціцца да льгаціравання ўсяго. Вось гэтага дапусціць нельга ні ў якім выпадку», — падкрэсліве Аляксандр Лукашэнка.

Новая Канстытуцыя, па яго меркаванні, павінна даць большыя магчымасці для самарэалізацыі людзей, бо многія з беларусаў мяркуюць, што дзяржава павінна рабіць усё: ад рамонту платоў да будаўніцтва жылля.

Прэзідэнт перакананы, што беларусы пазітыўна ўспрымуць прапановы камісіі аб замацаванні гарантый пенсійнага забеспячэння, падтрымкі сем'яў з дзецьмі, каштоўнасці сям'і і шлюбу, роўных магчымасцяў для асоб з інваліднасцю.

«***Прапанавана зрабіць палітычную сістэму краіны больш гарманічнай і збалансаванай, пераразмеркаваўшы паўнамоцтвы Прэзідэнта, парламента і ўрада, іншых органаў улады, усталяваўшы канстытуцыйны статус Усебеларускага народнага сходу, Цэнтрвыбаркама***. Таксама прапанавана пашырыць гарантыі судовай абароны правоў грамадзян. Прапрацавана практычна ўсё, пра што мы сталі казаць задоўга да пачатку работы Канстытуцыйнай камісіі», — заявіў кіраўнік краіны.

## КАНСТЫТУЦЫЯ, ЯКАЯ НЕАБХОДНА НАШЫМ ЛЮДЗЯМ

Пасля ён спыніўся на спрэчных момантах. «Я не знайшоў пераходных палажэнняў, якія даюць адказы на наступныя пытанні. Як будуць дзейнічаць органы ўлады пасля прыняцця Канстытуцыі? Калі гэта з Канстытуцыі не выцякае, нам трэба будзе дапрацаваць. Пераходныя палажэнні павінны быць, каб не ствараўся нейкі вакуум. Як будзе фарміравацца УНС, працаваць упаўнаважаны па правах чалавека? Канешне, можна ўсё адаслаць да законаў і падзаконных актаў. Гэта таксама нармальная тэхналогія, але пажадана, каб фундаментальнае было замацавана ў Канстытуцыі», — пералічыў кіраўнік краіны.

Таксама ў праекце не прадугледжаны дэкрэты Прэзідэнта. У такім выпадку, што будзе з ужо выдадзенымі? Няма адказу, які будзе механізм правядзення выбараў у адзіны дзень галасавання пры датэрміновым роспуску палат парламента.

«Вядома, гэта не ўсе праблемныя пытанні. Іх значна больш. Адным словам, нам ёсць што абмеркаваць. ***Мы павінны беражліва і рацыянальна паставіцца да прапаноў, якія па тых ці іншых прычынах не ўлічаны ў падрыхтаваным праекце Канстытуцыі. Акрамя таго, перакананы, што паступяць прапановы і падчас усенароднага абмеркавання***», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, будзе правільным, калі дашліфоўкай праекта Канстытуцыі пасля сустрэчы зоймуцца эксперты-юрысты, якія ў сціснутыя тэрміны дапрацуюць тэкст з улікам абмеркавання, ліквідуюць юрыдычныя супярэчнасці.

«Канстытуцыю адзін юрыст не напіша — ні з вопытам, ні без вопыту. Гэта павінны быць практыкі, людзі ад жыцця, — дадае Прэзідэнт. — ***Важна, каб уся работа па канстытуцыйным будаўніцтве стала асновай для кансалідацыі беларускага грамадства, заклала трывалы прававы падмурак для развіцця краіны на перспектыву***. Упэўнены, так і будзе, таму што канчатковае рашэнне прыме народ. Як я ўжо казаў, рэферэндум адбудзецца не пазней лютага наступнага года».

Прэзідэнт адзначыў, што наконт змен у Канстытуцыю існуюць розныя погляды ў грамадстве. Існуе меркаванне, што рэферэндум не патрэбны — неабходна ісці абраным шляхам, Асноўны Закон не перашкода.

«Гэта меркаванне не прымаецца. Мы паабяцалі правесці рэферэндум па Канстытуцыі. Ад нас патрабавалі перамен і не толькі перамен. Мы самі разумелі, што сутнасць жыцця і складаецца ў тым, каб пастаянна змяняцца толькі на карысць. ***Перамены — гэта не злом, гэта эвалюцыйнае развіццё. Канстытуцыя неабходная, бо неабходны нармальны рух наперад***. Будзем усведамляць гэта як перамены», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Самае галоўнае, адзначае Прэзідэнт, працуючы над праектам новай Канстытуцыі, распрацоўшчыкі павінны знаходзіць адказ на пытанні: навошта мы гэта робім і каму гэта трэба?

«Я магу адказаць на гэтыя пытанні. Робім гэтую Канстытуцыю для беларускага народа. Я вам параю: калі вы дакранаецеся да праекта Канстытуцыі, думайце пра сваіх дзяцей», — заклікае кіраўнік краіны.

Ён канстатуе, што праект Канстытуцыі разгледзяць органы ўлады, пройдзе этап грамадскага абмеркавання.

«Да лютага, я думаю, мы выйдзем на той праект Канстытуцыі, які неабходны нашым людзям і які створыць аснову для развіцця нашай дзяржавы праз перамены, а не праз злом», — акцэнтуе Аляксандр Лукашэнка.

## ПРАЦА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Па выніках сустрэчы Прэзідэнт даў задачу стварыць групу, якая дапрацуе праект. Перад вынясеннем удасканаленага дакумента на народнае абмеркаванне кіраўнік краіны зноў прапанаваў сабрацца такім складам.

«Група юрыстаў пасля народнага абмеркавання кожны радок разгледзіць і канчаткова юрыдычнай мовай прапіша дакумент, які будзе выносіцца на рэферэндум. А гэта група павінна быць не толькі з юрыстаў, а з розных спецыялістаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён прапанаваў і членам Канстытуцыйнай камісіі па жаданні падключыцца да гэтай групы.

«Неабходна ў найбліжэйшы тыдзень унесці прапановы па складзе такой групы, каб на працягу месяца дапрацавалі Канстытуцыю. Потым збяромся, яшчэ раз абмяркуем і вынесем на разгляд народа. Пасля юрысты яшчэ раз дапрацуюць. Мы збяромся перад рэферэндумам, атрымаеце праект, прачытаеце і канчаткова прымем рашэнне», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**



Першым з чаргі распрацоўшчыкаў новай Канстытуцыі выступіў **Старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр МІКЛАШЭВІЧ.** Ён расказаў пра навацыі ў Асноўны Закон. Сярод іх — удакладненне паўнамоцтваў органаў улады, пашырэнне паўнамоцтваў парламента, урада, устанаўленне канстытуцыйнага статусу УНС як вышэйшага органа народаўладдзя, удасканаленне выбарчай сістэмы, узмацненне сацыяльных гарантый, пашырэнне судовай абароны правоў грамадзян.

У раздзел «Асновы Канстытуцыйнага ладу» прапануецца, як працягнуў старшыня камісіі, устанавіць палажэнні аб развіцці Беларуссю атамнай энергетыкі ў мірных мэтах, указаць на выключэнне магчымасці ваеннай агрэсіі з тэрыторыі нашай краіны ў адносінах да іншых дзяржаў, прадугледзець абавязак дзяржавы захоўваць памяць пра герачны подзвіг народа пры абароне Айчыны ў гады ВАВ.

Прапануецца таксама замацаваць гарантыі дзяржаўнай падтрымкі сям'і з дзецьмі і што шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны. Праектам Канстытуцыі прадугледжана выключэнне нормы аб адкліканні дэпутатаў і членаў Савета Рэспублікі. Парламент прапануецца выбіраць на пяць гадоў і змяніць парадак сесіі: зрабіць адну з верасня да чэрвеня.

«Прапанавана захаваць Прэзідэнцкую форму праўлення, на занятку пасады Прэзідэнта ўстанавіць больш высокі ўзроставы цэнз у 40 гадоў, цэнз аселасці, пастаяннага пражывання ў Рэспубліцы Беларусь не менш чым 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі, цэнз грамадзянства — не мець грамадзянства замежнай дзяржавы. Устанавіць, што адна і тая ж асоба не можа быць Прэзідэнтам больш чым два тэрміны, абмежаваць паўнамоцтвы Прэзідэнта ў заканадаўчай сферы. Выключыць права выдаваць дэкрэты», — сказаў Пётр Міклашэвіч.

Усяго Канстытуцыйная камісія прапануе змены ў 53 артыкулы Канстытуцыі, уключэнне ў дакумент 14 новых артыкулаў, выключэнне — трох.

Канстытуцыйная камісія прызнала немэтазгодным уносіць змены ў артыкул пра смяротнае пакаранне, паколькі для гэтага неабходны спецыяльны рэферэндум. Але некаторыя з членаў групы прапаноўваюць адмяніць смяротнае пакаранне ці парадак яго прымянення.

Потым журналістам старшыня Канстытуцыйнай камісіі адзначыў, што гэта пытанне вельмі чуллівае, якое ўжо разглядалася на рэферэндуме ў 1996 годзе.

«Для правядзення спецыяльнага рэферэндуму патрабуецца адпаведная работа, сацыялагічнае даследаванне, тлумачальная работа, праверка гатоўнасці грамадства да такога адказнага рашэння», — заўважыў ён.

Як адзначае Пётр Міклашэвіч, мяркуючы змяніць ці выключыць артыкул аб праве працоўных калектываў вылучаць кандыдатаў у дэпутаты.

Старшыня Канстытуцыйнага Суда пасля нарады падкрэсліў, што працэс падрыхтоўкі да змянення Канстытуцыі працягваецца.

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

— Гэта дыскусія, па сутнасці, аб будучыні краіны, і таму яна не можа быць хуткай і лёгкай, — перакананa спікер верхняй палаты парламента. Яна расказала, што размова з удзелам Прэзідэнта была працяглай і сур'ёзнай, бо гутарка ішла аб вельмі важных рэчах — папраўках у Асноўны Закон.

Паводле яе слоў, многія члены Канстытуцыйнай камісіі выказвалі свой пункт гледжання па найбольш вострых пытаннях. Хоць такіх пытанняў засталося не так шмат. За час работы камісіі па большасці пазіцый удалося прыйсці да ўзгодненага меркавання.

— Разумеючы меру сваёй адказнасці, ты кожны раз думаеш над той ці іншай пазіцыяй у Канстытуцыі, наколькі гэта будзе правільна. Гэта ж нават не сённяшні дзень, а Асноўны Закон будучыні, па якім будзе жыць моладзь, якая ідзе за намі, — звярнула ўвагу Наталля Качанава.

Па выніках праведзенай дыскусіі прынята рашэнне дапрацаваць праект паправак на ўзроўні экспертаў, затым вынесці яго на ўсенароднае абмеркаванне. Пасля юрысты дашліфуюць фармулёўкі, і тэкст абноўленай Канстытуцыі будзе яшчэ раз разгледжаны з удзелам кіраўніка дзяржавы, які прыме рашэнне аб яго вынясенні на рэферэндум.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ, дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя»:**

— Па трох спрэчных пытаннях, якія выносіліся на нараду з удзелам Прэзідэнта, дадзены вычарпальныя адказы. Я прапанаваў гэтыя адказы на суд калег Канстытуцыйнай камісіі і кіраўніку краіны. У прынцыпе па пытанні камплектавання УНС і выключнай меры пакарання я пачуў, што Прэзідэнт падтрымлівае маю пазіцыю. УНС павінна камплектавацца не толькі прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса. Нельга «заклікліваць» народнае веча ў бюракратычныя рамкі. Па выключнай меры пакарання ішлі гарачыя дыскусіі. Ёсць у Канстытуцыйнай камісіі людзі, якія катэгарычна супраць выключнай меры, але кіраўнік краіны стаіць на папярэдняй пазіцыі. Многія іншыя члены камісіі выступаюць за захаванне статусу кво. Нельга выключаць, што паралельна з праектам новай Канстытуцыі будзе вынесена на рэферэндум пытанне аб выключнай меры пакарання. Што датычыцца працоўных калектываў і іх права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты, мы будзем дэбатаваць па гэтай тэме. Мой пункт гледжання заключаецца ў тым, што працоўныя калектывы зараз і ў 1994 годзе — розныя з'явы па сваёй сутнасці. Нельга выключаць таго, што ў будучыні прыватнікі атрымаюць магчымасць маніпуляваць такім чынам меркаваннем людзей, разумеючы іх залежнасць ад працоўных адносін, і вылучаць падкантрольных кандыдатаў у дэпутаты.

Выбарчая акруга

# ВЫХАВАЦЬ МОЛАДЗЬ У ЛЮБОВІ ДА РАДЗІМЫ, У ПАШАНЕ ДА ГІСТОРЫІ

## Дэпутат Палаты прадстаўнікоў — пра работу ў акрузе, сустрэчы з выбаршчыкамі і клопат пра юных грамадзян

**З дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, членам Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Яўгенам ЗАЙЦАВЫМ мы гаворым найперш пра работу ў акрузе. У акругу Яўгена Станіславіча ўваходзіць частка Брэста і Брэсцкага раёна. Дэпутат сустракаецца са сваімі выбаршчыкамі не толькі на прыёмах, ён нярэдка бывае ў працоўных калектывах, прымае ўдзел у самых розных мерапрыемствах.**



**Яўген ЗАЙЦАЎ у працоўным калектыве, падчас сустрэчы з выбаршчыкамі.**

Наша сустрэча адбылася менавіта ў тыдзень работы парламентарыя ў сваёй акрузе. Але напачатку размова зайшла пра галоўны клопат дэпутата — заканатворчую дзейнасць.

— Цяперашнюю работу ў Палаце прадстаўнікоў звычайна называю чацвёртым вопытам дэпутацкай дзейнасці, — пачынае гаворку Яўген Зайцаў. — Адно скліканне прадстаўляў выбаршчыкаў у гарадскім Савеце, два — у абласным, зараз вось у вышэйшым заканадаўчым органе краіны. Для таго каб прымаць законы, якія будуць працаваць на карысць грамадства, трэба іх выверыць з пункту гледжання практыкі, пракансультавацца з тымі, хто будзе іх выконваць. У ходзе работы над праектамі законаў праводзім узгадненні з усімі зацікаўленымі ведамствамі. Зараз ідзе абмеркаванне Кодэкса аб адукацыі, закона аб прафілактыцы правапарушэнняў, закона аб дзяржаўнай службе. Гэтая работа праводзіцца не толькі ў кабінетах, але і ў акрузе. Людзі выказваюць прапановы на асабістых прыёмах, а таксама звяртаюцца пісьмова. І кожны зварот трэба разгледзець, даць адказ.

***— Думаю, зараз дэпутату не проста праводзіць сустрэчы ў працоўных калектывах, асабліва вялікіх.***

— Бывае вельмі нават не проста, але туды трэба ісці, каб ведаць настрой людзей, іх меркаванне. Найбольш пытанняў у калектывах зараз узнікае пра прычыны, вынікі, наступствы падзей мінулага года. У ходзе размовы становіцца відавочным, што нашы людзі былі недастаткова інфармаваныя. Цяпер, думаю, кожны ведае, што пратэсны настрой падмацоўваўся з-за мяжы, многае каардынавалася адтуль. Даводзіцца тлумачыць, расказваць, якім шляхам мы сёння ідзём, чаму да Беларусі прымяняюцца санкцыі эканамічнага і палітычнага характару, чаму нават у гэтых умовах эканоміка краіны не стаіць на месцы, сацыяльныя праграмы не прыпыняюцца, усе пункты ўзаемных гарантый выконваюцца. На прыкладах, лічбах, фактах даводзіцца пераконваць людзей, што, нягледзячы на ўвесь ціск, мы не стаім на месцы, а развіваемся, і кіраўніцтвам дзяржавы прымаюцца правільныя рашэнні на гэтым этапе. Калі вось так адкрыта размаўляеш з людзьмі, яны пачынаюць па-іншаму глядзець на праблему. Так што ў калектывы трэба ісці.

***— З якімі пытаннямі найчасцей прыходзяць выбаршчыкі на прыёмы?***

— Найчасцей гэта ўсё ж праблемы добраўпарадкавання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, яшчэ — месцы ў дзіцячых садках і школах, адным словам, жыццёвыя пытанні, якія з'яўляюцца важнымі для чалавека сёння. Вырашыць іх дэпутат Нацыянальнага сходу, як і дэпутат іншага ўзроўню, можа толькі калі пойдзе ў мясцовы орган выканаўчай улады і папросіць дапамагчы. Калі пытанне не ўпіраецца ў фінансаванне, то часцей за ўсё яно вырашаецца, а калі на вырашэнне праблемы патрэбны сродкі, часам немалыя, то даводзіцца тлумачыць чалавеку парадак уключэння мерапрыемства ў планы работы, выдзялення сродкаў з бюджэту. Думаю, ва ўсіх маіх калег работа ў гэтым кірунку будуецца прыкладна аднолькава.

***— Ведаю, што вы шмат увагі ўдзяляеце патрыятычнаму выхаванню моладзі, пытанням захавання гістарычнай памяці, увекавечання подзвігу народа ў мінулай вайне.***

— Так, сваім абавязкам лічу ў тым ліку і за свой дэпутацкі перыяд аказаць дапамогу ў развіцці Маладзёжнага патрыятычнага цэнтра, які створаны на базе 125-га стралковага палка Брэсцкай крэпасці. У свой час там быў штаб 111-й артылерыйскай брыгады, якой я камандаваў. Гэты аб'ект дарагі мне ў тым ліку гісторыяй маёй часці, яе ветэранаў, ну і найперш гісторыяй ваеннага перыяду. Цэнтр быў адкрыты 3 ліпеня 2018 года, там ёсць усе ўмовы для адначасовага знаходжання 30—40 чалавек. Школьнікі з задавальненнем едуць у цэнтр. Сваю першапачатковую задачу ён выконвае. Мы бачым, як многа новага дазнаюцца дзеці за тыдзень у ваенна-патрыятычным лагеры, як яны часам сталеюць на вачах. Але гэта нібы кропля ў моры ў справе выхавання моладзі краіны. Мы шмат раіліся з кіраўніцтвам цэнтра, з упраўленнем адукацыі, па маім запрашэнні ў канцы мінулага года сюды прыязджаў міністр абароны Віктар Хрэнін. Пасля паездкі міністр далажыў пра цэнтр кіраўніку дзяржавы, і як вынік зараз ва ўрадзе прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні рэспубліканскага патрыятычнага цэнтра з адначасовым знаходжаннем да 500 школьнікаў. Дзеці будуць ехаць з усёй краіны, праяўляецца цікавасць і з боку расійскіх адукацыйных і грамадскіх арганізацый, школьнікі гатовыя ехаць адтуль. У нас ёсць на чым выхоўваць. Патэнцыял Брэсцкай крэпасці не задзейнічаны цалкам у плане выхавання. Мы бачым, як гарацць вочы дзяцей, калі ім паказваюць і расказваюць пра подзвіг герояў вайны на месцы, калі можна прайсці, умоўна кажучы, шляхамі маёра Гаўрылава альбо камісара Фаміна. Праграма распрацавана цікавая, яе можна ўдасканальваць, развіваць. Сёння пытанне разглядаецца ў Мінадукацыі, іншых ведамствах. Як дэпутат аказваю ўсялякае садзейнічанне.

Ну і не толькі цэнтр спрыяе патрыятычнаму выхаванню. Па меры магчымасці стараемся нешта зрабіць па рэстаўрацыі, аднаўленні помнікаў ваенных падзей. Бывае, даводзіцца шукаць спонсараў, добра, што многія гаспадарнікі адклікаюцца. Калі ўдаецца аднавіць хоць невялікі помнік, узнікае адчуванне, што ўкладзена цагліна ў агульную добрую справу.

Хачу яшчэ сказаць аб неабходнасці захавання гістарычнай памяці, яе пераемнасці. Не так даўно ў Прыбараве Брэсцкага раёна адкрывалі помнік ахвярам вайны. Там сабралася вялікае мноства людзей з усіх навакольных вёсак. Аказалася, што некаторыя памятаюць ваенныя падзеі, іншыя ведаюць ад бацькоў, і ўсе вельмі шануюць памяць. Было відавочна, як важна не страціць, перадаць гэтыя пачуцці наступным пакаленням.

***— Ну і як, паводле вашых адчуванняў, моладзь цяперашняя гатовая прыняць гэтую эстафету?***

— Думаю, гатова. У лютым у Брэсцкім раёне прысутнічаў на мерапрыемстве з нагоды гадавіны вываду нашых войск з Афганістана. Старшакласніца з Дамачаўскай школы прачытала ўласны верш, прысвечаны воінам-афганцам. Гэта былі такія душэўныя, шчырыя, пранікнёныя радкі, што камяк падступаў да горла ад гонару, ад радасці. Нешта падобнае адчуваў колькі гадоў таму, калі ехаў на мерапрыемства ў крэпасць на 22 чэрвеня. Тады быў ваенным камісарам вобласці, спяшаўся, але на дарозе заўважыў ветэрана з медалямі. Вядома, спыніўся, прапанаваў падвезці. А ён засмяяўся ў адказ: «Я да Берліна дайшоў, лічы, пехатою, а ты думаеш, да крэпасці зараз дарогу не асілю? Дзякуй, сынок, я сам павінен». І пайшоў... Вось цяпер падумалася, што добрыя праўнукі растуць у нашых ветэранаў. А мы павінны выхоўваць іх у любові да Радзімы, у пашане да сваёй гісторыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Цана газу ў Еўропе ўпершыню ў гісторыі пераадолела адзнаку $1000



Як мы і прагназавалі, цэны на блакітнае паліва дасягнулі ўзроўню долар за куб. Цана ў Еўропе падскочыла ўслед за цэннікамі ў Азіі, дзе лістападаўскі ф'ючарс на спотавых ЗПГ-індэкс JKM Platts напярэдадні дадаў адразу $60 і дасягнуў $1042 за тысячу кубаметраў. Стары свет ва ўмовах агульнага дэфіцыту паставак газу (па газаправодах і ў звадкаваным выглядзе) вымушаны канкурыраваць з прэміяльным рынкам Азіі. Кошт найбліжэйшага (кастрычніцкага) ф'ючарса на спотавых індэкс TTF на газ на біржы ICE Futures дасягнуў 85,245 еўра за мегават-гадзіну — $1030 за тысячу кубаметраў. Гістарычны рэкорд цаны кантракта «на дзень наперад» раней быў зафіксаваны 1 сакавіка 2018 года — 76 еўра за МВт/г, або $969 за тысячу кубаметраў. Тады Еўропу накрыў легендарны халодны фронт. Толькі той рэкорд прыйшоўся на канец зімы, а ацяпляльны сезон 2021/2022 яшчэ толькі пачынаецца, заўважаюць аналітыкі.

### У Вялікабрытаніі мабілізуюць ваенных для дастаўкі бензіну на АЗС

Урад Вялікабрытаніі прывёў армію ў стан павышанай гатоўнасці, каб справіцца з паліўным крызісам, які ахапіў краіну, паведаміла «Бі-бі-сі». Мяркуецца, што ў выпадку крайняй неабходнасці вайсковыя кіроўцы перасядуць за руль бензавозаў і будуць развозіць паліва па аўтазапраўках, папярэдне прайшоўшы кароткае навучанне. Гэта можа стаць «неабходнай часовай мерай для забеспячэння дадатковага ланцужку паставак», заявіў міністр энергетыкі і прамысловай стратэгіі Вялікабрытаніі Квазі Квартэнг. У краіне ўжо некалькі дзён назіраецца ажыятажны попыт на бензін. Ад аўтазаправак уздоўж дарог цягнуцца вялізныя чэргі з машын, якія блакіруюць рух. Брытанскія ўлады заяўляюць, што праблем з палівам у краіне няма, а крызіс выкліканы вострым недахопам кіроўцаў бензавозаў, што назіраецца ў краіне ўжо некалькі месяцаў. Паводле ацэнак арганізацыі Freight UK, якая прадстаўляе індустрыю грузавых перавозак, асноўныя прычыны ўзніклай сітуацыі — выхад Вялікабрытаніі з ЕС, пандэмія COVID-19, змена сістэмы падаткаабкладання заробкаў кіроўцаў і неадпаведнасць узроўню іх зарплаты складаным умовам працы.

# НАТАРЫУС — САСТАРЭЛЫМ, АДВАКАТ — МАЛАЗАБЯСПЕЧАНЫМ

**Акцыя па бясплатным кансультаванні грамадзян адбудзецца 2 кастрычніка ў 89 краінах — членах Міжнароднага саюза натарыята, у тым ліку ў нашай краіне. А 1 кастрычніка ў Дзень састарэлых людзей юрыдычныя кансультацыі, адвакацкія бюро і адвакаты Беларусі акажуць бясплатную прававую дапамогу ў выглядзе кансультацый малазабяспечаным людзям.**

Беларуская натарыяльная палата штогод праводзіць пяць рэспубліканскіх акцый па бясплатным кансультаванні грамадзян і прадстаўнікоў бізнесу.

Паколькі 2 кастрычніка — субота, варта помніць, што па бясплатную дапамогу можна звярнуцца ў натарыяльныя бюро і канторы Мінскай абласной, Віцебскай і Магілёўскай натарыяльных акруг, якія прымаюць грамадзян у выхадны дзень. У Гомельскай натарыяльнай акрузе таксама будзе працаваць шэраг натарыяльных бюро і кантор, якія ўдзельнічаюць у акцыі. Іх спіс, а таксама графік работы, нумары тэлефонаў і адрасы прыведзены на сайце Беларускай натарыяльнай палаты (БНП) https://belnotary.by/ у раздзеле «Знайсці натарыуса», падкрэсліў **Артур СТРЭХ, памочнік старшыні Беларускай натарыяльнай палаты**:

— Жыхары Брэсцкай вобласці змогуць задаць свае пытанні 2 кастрычніка падчас прамых тэлефонных ліній у натарыяльнай канторы Ленінскага раёна Брэста, натарыяльнай канторы № 1 у Баранавічах і натарыяльнай канторы ў Пінску. На Гомельшчыне натарыусы правядуць прамую тэлефонную лінію сумесна з адміністрацыяй Савецкага раёна Гомеля. Іншыя бясплатныя натарыяльныя кансультацыі ў Гомельскай вобласці адбудуцца ў Кармянскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, Нараўлянскім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, Брагінскім райвыканкаме і ва ўстанове адукацыі «Жыткавіцкі сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам».

У Гродне бясплатных натарыусаў з 11 гадзін можна будзе знайсці ў публічным цэнтры прававой інфармацыі на базе Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага (г. Гродна, вул. Карбышава, 17). А жыхароў сталіцы з 10 гадзін раніцы да 13.00 натарыусы чакаюць у публічным цэнтры прававой інфармацыі на базе Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Купалы (г. Мінск, вул. В. Харужай, 16).

**Ірына СІДАРОК.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Крачак Іне Юр'еўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

Прыярытэты

# Ключавыя драйверы Садружнасці

**Ва ўмовах турбулентнасці ў свеце каапэрацыя эканомік краін СНД мае вырашальнае значэнне. Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА падчас міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «30 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў: вынікі, перспектывы», паведаміла БелТА.**

«Сёння СНД — прызнаная міжнародная супольнасцю рэгіянальная арганізацыя з практычным змястоўным напаўненнем дзейнасці і шырокім ахопам тэм у інтарэсах краін-удзельніц. Адным з ключавых дасягненняў СНД стала аб'ектыўнае захаванне цесных чалавечых кантактаў і абменаў, даверных палітычных адносін і шматпланавых гаспадарчых сувязяў з падтрыманнем тэндэнцыі на далейшую інтэграцыю. Асаблівае значэнне ў сувязі з гэтым мае створаная зона свабоднага гандлю таварамі, якая забяспечвае спрыяльныя ўмовы для эканамічнага развіцця нашых краін, — сказаў Ігар Петрышэнка. — Заўважу, што ва ўмовах пастаяннай турбулентнасці ў свеце кааперацыя ўзаемадапаўняльных эканомік дзяржаў СНД мае вырашальнае значэнне. І гэта пацвярджаецца дынамікай узаемнага гандлю і інвестыцыйнага супрацоўніцтва на прасторы Садружнасці. Прыманыя меры ў інтэграцыйным фармаце ў сукупнасці з намаганнямі дзяржаў на нацыянальным узроўні далі магчымасць забяспечыць рост узаемнага гандлю дзяржаў — удзельніц СНД у першым паўгоддзі 2021 года на 26,7 працэнта».

У дату 30-годдзя СНД Беларусь прыняла старшынства ў органах Садружнасці. «Мы сканцэнтравалі сумесную дзейнасць на наступных асноўных кірунках. Першы — гэта далейшае паглыбленне інтэграцыйных працэсаў на прасторы СНД. У перспектыве ён прадугледжвае выхад на стварэнне шырокай еўразійскай зоны супрацоўніцтва, у тым ліку за кошт спалучэння з іншымі рэгіянальнымі арганізацыямі і аб'яднаннямі, у першую чаргу ЕАЭС, АДКБ, ШАС. Другі — садзейнічанне развіццю агульнай эканамічнай прасторы, павышэнне эфектыўнасці гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, рэальнае скарачэнне перашкод для свабоднага перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталаў і рабочай сілы», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Тэмп росту ВУП краін СНД за студзень — ліпень 2021 года ў параўнанні з аналагічным перыядам летась склаў 104,4 працэнта, прадукцыі прамысловасці — 104,2 працэнта, інвестыцый у асноўны капітал — 105,4 працэнта, перавозкі грузаў — 105,4 працэнта.

У якасці трэцяга кірунку супрацоўніцтва Ігар Петрышэнка назваў умацаванне гуманітарных сувязяў, пашырэнне кантактаў у галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорту і турызму. «І чацвёрты прыярытэт, які апошнім часам з'яўляецца не менш значным, чым названыя вышэй, — гэта каардынацыя намаганняў у галіне абароны і міжнароднай бяспекі», — дадаў ён.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, працягваецца работа над праектам пагаднення аб свабодным гандлі паслугамі. «Разлічваем, што сумесная плённая праца дасць магчымасць вынесці праект на разгляд вышэйшых органаў Садружнасці ў найбліжэйшы час. Яго падпісанне забяспечыць дадатковую магчымасць устойлівага эканамічнага развіцця ў інтарэсах краін Садружнасці на аснове комплекснай зоны свабоднага гандлю», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

# АДВАЖЫЦЦА І... ПАЧАЦЬ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



«Увогуле, у Беларусі няма такой асобнай прававой катэгорыі, як жаночы бізнес. Такім чынам, заканадаўча не ўрэгулявана пытанне аказання спецыяльнай дзяржаўнай падтрымкі за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў жанчынам-прадпрымальнікам (у прыватнасці давання якіх-небудзь спецыяльных ільгот, прэферэнцый і іншых стымулаў). Жанчыны, якія сёння хочуць адкрыць уласную справу ў форме індывідуальнага прадпрымальніцтва або камерцыйнай арганізацыі, дзейнічаюць на агульных падставах і карыстаюцца тымі прэферэнцыямі, якія даступны для адпаведнай катэгорыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва», — гаворыць **намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына БАБАЧОНАК.**

Як паказалі даследаванні, на першы план у развіцці менавіта жаночага бізнесу выходзяць пытанні кансультацыйнай, больш нават псіхалагічнай падтрымкі жаночага прадпрымальніцтва, ментарства, пазітыўныя прыклады іншых жанчын-прадпрымальнікаў, падтрымка СМІ па шырокім асвятленні гісторый поспеху, бізнес-навучанне. Калі жанчыны будуць уваходзіць у прадпрымальніцтва і паказваць важкія вынікі, распавядаць свае гісторыі, грамадства перастане іх недаацэньваць.

**Выканаўчы дырэктар ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Васіль АЛЯКСЕЕЎ** лічыць, што развіццё жаночага прадпрымальніцтва — гэта адзін з характэрных трэндаў бізнес-асяроддзя.

Год таму банк вылучыў падтрымку жаночага прадпрымальніцтва ў асобны крэдытны прадукт, мэтай якога з'яўляецца стымуляванне жаночага бізнесу. У яго рамках за гэты перыяд прафінансаваны 116 праектаў на суму больш за 15 млн рублёў, а гэта мікрапрадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія заняты ў розных сферах дзейнасці: ад гандлю да паслуг па вытворчасці сельскай гаспадаркі. «У Беларусі ёсць вялікі патэнцыял для развіцця прадпрымальніцтва, у тым ліку і жаночага. Мы адчуваем неабходнасць і таму актывізуем не толькі фінансавую, але і нефінансавую падтрымку малому і сярэдняму бізнесу ў краіне: а гэта кансультацыйныя паслугі, падтрымка стартапаў, а галоўнае, гарантыі тым суб'ектам малога і сярэдняга бізнесу, якія з'яўляюцца ўмоўна некрэдытаздольнымі і з дапамогай такіх гарантый могуць атрымаць крэдыт на развіццё сваёй справы», — падкрэсліў Васіль Аляксееў.

Канешне, магчымасці адкрыць сваю справу ёсць і ў мужчын, і ў жанчын. Аднак у жанчын спецыфічныя бар'еры. Міністэрствам эканомікі і незалежнымі інстытутамі былі праведзены даследаванні па ацэнцы маштабаў уцягнутасці жанчын у прадпрымальніцкую дзейнасць, а таксама па выяўленні сацыяльных, эканамічных і культурных бар'ераў, якія ўплываюць на эканамічныя паводзіны і выбар кар'еры для жанчыны, расказала Ірына Бабачонак. У выніку працы, якая была праведзена, выяўлена некалькі груп фактараў, якія можна назваць умоўнымі перашкодамі для ўваходжання жанчыны ў бізнес. Дадзеныя бар'еры ўключаюць сацыяльны ціск, сямейныя абавязкі, якія нясе на сабе жанчына. Таксама гэта пэўны недахват кіраўніцкага вопыту, стратэгічнай арыентацыі, залежнасць ад меркавання соцыуму і агульныя выклікі бізнес-асяроддзя, характэрныя для ўсіх катэгорый суб'ектаў прадпрымальніцтва. Сацыяльная роля жанчыны вымушае яе забяспечваць клопат пра сям'ю, догляд дзяцей. У той час, згодна з даследаваннямі, толькі 9 % мужчын-прадпрымальнікаў гатовыя ўзяць на сябе і гэты абавязак. Такім чынам, жанчыны больш матываваныя пачынаць свой бізнес у сферах, якія не маюць складанасцяў, нейкіх адміністрацыйна-вытворчых працэсаў і дазваляюць сумяшчаць некалькі роляў. У той жа час, каб займацца вытворчым, высокарэнтабельным бізнесам, арыентаваным на хуткі рост, маштабаванне, — жанчынам, як яны самі прызнаюцца, не хапае пэўных эканоміка-прававых ведаў.

Яшчэ адзін бар'ер, які быў выяўлены, — гэта фактар паводзін. У прыватнасці, ступень унутранай гатоўнасці саміх жанчын пачаць прадпрымальніцкую дзейнасць. Тут галоўны фактар, які можа з'яўляцца перашкодай, — унутраная няўпэўненасць у сабе, у сваіх сілах. Гэта абумоўлена культурнымі традыцыямі, меркаваннем соцыуму, бо жанчыны з прычыны псіхалагічных асаблівасцяў больш схільныя да таго, каб прыслухоўвацца да меркаванняў навакольных. Такія паводзіны таксама абумоўлены і імкненнем пазбягаць высокіх рызык, большай схільнасцю да аналізу наступстваў тых рашэнняў, якія прымаюцца.

Дарэчы, жанчыны часцей адмаўляюцца ад прыцягнення пазыковых грашовых сродкаў. Статыстыка кажа пра тое, што толькі 10 % крэдытаў на развіццё прадпрымальніцтва прыпадаюць на долю жаночага бізнесу. У асяроддзі аналітыкаў таксама існуе меркаванне, што, з аднаго боку, жанчыны не вельмі гатовыя прыцягваць дадатковыя фінансавыя рэсурсы і пазыковыя сродкі, а з іншага — сама банкаўская сістэма больш прадузята ставіцца да жанчын-прадпрымальнікаў. «На мой погляд, гэты тэзіс досыць дыскусійны, — кажа Ірына Бабачонак. — Мы сумесна з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця правялі даследаванне. Высветлілася, што жаночыя заяўкі на атрыманне крэдыту аб'ектыўна слабейшыя, аднак у наступным жанчына аказваецца больш адказным, выканаўчым пазычальнікам. Момантаў з незваротнай часткай менавіта ў гэтай катэгорыі нашмат менш».

«Стагоддзямі складвалася так, што наша грамадства — гэта прадукт патрыярхату і ў гэтым грамадстве быў выразны падзел роляў на мужчынскую і жаночую, — адзначыў **выканаўчы дырэктар ААТ «Белінвестбанк» Дзмітрый РАМАНОЎСКІ.** — Але за апошнія 15—20 гадоў адбылася істотная трансфармацыя грамадства. Сёння жанчыны — не толькі захавальніцы хатняга ачага, яны могуць быць і здабытчыцамі. І гэта пацвярджае аналіз нашага супрацоўніцтва з жаночым бізнес-асяроддзем. Шчыра кажучы, нават не магу знайсці сферу эканомікі, у якой ні бралі бы ўдзел сучасныя жанчыны. Прыкладна трэціна нашых кліентаў — суб'екты жаночага прадпрымальніцтва. Для таго каб жанчыны адчувалі сябе больш упэўнена, мы стварылі Цэнтр падтрымкі і развіцця жаночага прадпрымальніцтва, сферай дзейнасці якога з'яўляецца ментарская падтрымка. З 2019 года там арганізаваны спецыяльныя майстар-класы і іншыя праграмы па адукацыі жанчын у сферы бізнесу».

Паводле слоў Ірыны Бабачонак, ужо стала традыцыйным правядзенне тыдня бізнесу і кар'еры для жанчын. У рамках гэтага тыдня, як і ў папярэднія два гады, будзе арганізавана серыя розных адукацыйных, матывацыйных, дыскусійных мерапрыемстваў. У чарговы раз плануецца падтрымаць глабальную ініцыятыву, якая праводзіцца пад эгідай ААН, — Сусветны дзень жаночага прадпрымальніцтва. Удзельнікамі гэтай ініцыятывы з'яўляюцца 144 краіны свету, у тым ліку і Беларусь. Вясной наступнага года запланавана яшчэ адна маштабная падзея — круглы стол на тэму «Бізнес і жанчыны».

«Што датычыцца мер па выпрацоўцы традыцыйных спосабаў падтрымкі, да якіх адносіцца сістэма льгот, прэферэнцый, падатковых, адміністрацыйных паслабленняў, — гэта пытанне знаходзіцца на парадку дня, — падкрэсліла Ірына Бабачонак. — У нас цяпер ідзе маштабная рэструктурызацыя сістэмы дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў цэлым. У рамках гэтай работы мы, вядома ж, звяртаем увагу на магчымасць выдзялення жаночага бізнесу ў асобную катэгорыю для садзейнічання. Усю работу па рэфармаванні сістэмы дзяржпадтрымкі плануем скончыць да 2023 года. Спадзяёмся, што там з'явіцца спецыяльны праект і па жаночым прадпрымальніцтве».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**




Не шукаю скарбніцы чужыя —
Ўдосталь мне свайго ў маіх краях,
Верасня дукаты залатыя
Дораць мне бярозкі у лясах.
Дорыць восень срэбра павуціны,
Аксаміты росных мурагоў,
Дорыць дарагія успаміны
Летніх шчасных, сонечных дзянькоў.
Не змарную я ні ў якім разе,
Не згублю ні ў якой бядзе —
Я за скарбы гэтыя ў адказе,
Не аддам нікому і нідзе.



Жывіце ў бяспецы

# РЫХТУЙ ПЕЧ ЗАГАДЗЯ

## Каб не застацца зімой без даху над галавой, паклапаціцеся аб ацяпленні сёння

**Верасень сёлета асабліва не вызначыўся восеньскай цеплынёй, якая яшчэ характэрная для гэтай пары года. Ацяпленне ў гарадах уключылі раней, чым звычайна. Вясковыя жыхары такую раскошу, як не мерзнуць у хаце, маглі сабе дазволіць яшчэ раней. Але ці ўсе з іх праверылі стан сваёй печы загадзя, а адпаведна паклапаціліся аб уласнай бяспецы?**

### АГОНЬ-ЗАБОЙЦА

На працягу многіх гадоў парушэнне правіл усталявання печы, а таксама няправільная яе эксплуатацыя з'яўляецца адной з найбольш частых прычын пажараў. Менавіта з-за гэтага ў лютым гарэў прыватны жылы дом у вёсцы Муляры Пастаўскага раёна. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, устанавілі ў хаце задымленне. Ачаг узгарання быў ліквідаваны ўжо да іх прыезду — сын гаспадара, які жыве ў суседняй вёсцы Хацілы, вырашыў праведаць бацьку, а вымушаны быў яго ратаваць і змагацца з агнём. Аднак гаспадар хаты, пенсіянер 1950 года нараджэння, ужо быў без прыкмет жыцця.

Яшчэ адзін мужчына вясной загінуў на пажары ў Рэчыцкім раёне. Калі ў вёску Дзямехі прыбылі супрацоўнікі МНС, дах быў поўнасцю ахоплены агнём, дом гарэў знутры. Ратавальнікі знайшлі на падлозе мужчыну 1957 года нараджэння, які быў без прытомнасці. Да прыбыцця хуткай дапамогі яму праводзілі рэанімацыйныя мерапрыемствы. Безвынікова. Урачы, якія неўзабаве пад'ехалі, таксама не змаглі вярнуць чалавека да жыцця. Як высветлілася пазней, гэта быў сужыцель гаспадыні, якая на момант трагедыі знаходзілася ў сына ў суседняй хаце.

— У нашы дні пячное ацяпленне па-ранейшаму шырока распаўсюджана, — адзначае **памочнік міністра — прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ**. — Калі ў гарадах жыхары прыватнага сектара ў асноўным перайшлі на газ, то ў сельскай мясцовасці ў халодны час года многія аддаюць перавагу печам, грубам, комінам. І справа тут не столькі ў жаданні з любоўю глядзець на агонь і чуць трэск пален. Дровамі паліць прасцей, аднак, на жаль, небяспечна. За восем месяцаў бягучага года ў выніку парушэння правіл уладкавання і эксплуатацыі пячнога ацяплення ў краіне адбылося 844 пажары, у якіх загінулі 25 чалавек.

### ДРУГІ ШАНЦ НА ЖЫЦЦЁ

А вось дваім пенсіянерам з Любанскага раёна, можна сказаць, яшчэ пашанцавала: атруціўшыся ўгарным газам, яны абышліся толькі шпіталізацыяй. За гэта муж і жонка ўдзячныя сваім суседзям, якія ў дзве гадзіны ночы звярнулі ўвагу на запаленае святло ў іх хаце. Менавіта суседзі выклікалі хуткую дапамогу. Папярэдняя прычына таго, што адбылося, — заўчаснае закрыццё заслонкі печы.

Невыкананне элементарных правіл яе эксплуатацыі каштавала жыхару вёскі Зыкава, што на Лагойшчыне, гаспадарчай пабудовы. Напярэдадні пенсіянер выбраў у металічнае вядро попел і паставіў яго ў пабудову, дзе захоўваў бульбу. Хлеў згарэў поўнасцю. Летнюю кухню, куды перакінуўся агонь, выратавалі супрацоўнікі МНС. Апошнія, дарэчы, перш чым вынесці попел на бяспечную адлегласць ад будынкаў і пабудоў, рэкамендуюць яго заліць вадой да поўнага згасання.

Калі б не аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які сярод ночы разбудзіў гаспадароў хаты ў вёсцы Ямінск Любанскага раёна, можна толькі здагадвацца, чым усё магло скончыцца. Не справіўшыся з агнём самастойна, муж і жонка пакінулі хату. Лакалізавалі, а пасля ліквідавалі ўзгаранне ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння. Агонь знішчыў маёмасць, пашкодзіў сцены ў пакоях. Аднак галоўнае, што людзі засталіся жывыя. Версія, якая стала прычынай пажару, класічная: парушэнне правіл эксплуатацыі печаў, цеплагенерыруючых агрэгатаў і прылад.

Па гэтай жа прычыне або з-за перапальвання печы адбыўся пажар у дачным доме ў садовым таварыстве «Зялёны луг», што недалёка ад Маладзечна. Напярэдадні на лецішча прыехаў муж гаспадыні хаты. Каб было цёпла, вырашыў прапаліць у печы. Вечарам ён вярнуўся дадому. А ўжо бліжэй да ночы ратавальнікі спяшаліся на выклік, аб якім паведамілі сведкі: у садовым таварыстве гарыць хата. У выніку пажару быў пашкоджаны дах усяго дома, поўнасцю згарэла мансарда.



### НЕ ПАКІДАЙЦЕ БЕЗ НАГЛЯДУ!

Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях чарговы раз нагадваюць, што выкарыстанне вогненебяспечных і гаручых вадкасцяў з'яўляецца шкодным як для здароўя, так і ў цэлым для жыцця. Чамусьці менавіта такім чынам гэтай зімой вырашыў распаліць печ адзін з жыхароў Капыля. Агонь, які выйшаў за межы печкі, пачаў хутка распаўсюджвацца. Калі прыехалі ратавальнікі, ужо адкрытым полымем гарэў дах. Малады чалавек 2001 года нараджэння, які, відаць, і распальваў печ, пакідаючы жыллё, атрымаў тэрмічныя апёкі спіны. Пацярпелы быў дастаўлены ў бальніцу.

Нічога не прадвяшчала бяды, калі жыхарка аграгарадка Ракаў Валожынскага раёна запаліла кацёл і, падкінуўшы дроў, прылягла адпачыць. Калі жанчына прачнулася, памяшканне ўжо было запоўнена дымам. Аўтаномны пажарны апавяшчальнік у доме адсутнічаў. На дапамогу прыбег сусед, але агульнымі намаганнямі пажар патушыць не ўдалося. Ліквідавалі ўзгаранне ратавальнікі, якія прыбылі на месца.

— Калі я падкідвала дровы апошні раз, не зачыніла дзверцы, — успамінае той дзень гаспадыня. — Думала, што я ж побач: калі нешта здарыцца, то ўбачу. Толькі сама не памятаю, як заснула. Калі прачнулася, спалохалася. Дыму было столькі, што я проста не ведала, што рабіць, разгубілася.

Па словах суседа, які кінуўся на дапамогу, у сябе ў кватэры ён адчуў пах дыму. «Выйшлі з жонкай на вуліцу, абышлі вакол дом, але нічога не выявілі, — расказвае мужчына. — Затым зайшлі ў другую кватэру, дзе таксама нічога не было. Я хутчэй пабег у першую і ўбачыў, што яна запоўнена дымам. Гаспадыня была ў разгубленасці. Адразу спрабаваў тушыць самастойна, але гэта аказалася не так проста. Ратавальнікі справіліся хутка».

На шчасце, пацярпелых у гэтай сітуацыі не было. Што датычыцца маёмасці, каля ацяпляльнага катла была пашкоджаная падлога. Іншыя кватэры ў трохкватэрным доме не пацярпелі.

— Катэгарычна забараняецца пакідаць адчыненымі дзверцы і печ, якая паліцца, без нагляду — гэта прамы шлях да пажару, — нагадвае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Участак падлогі з гаручых матэрыялаў перад адтулінай для палення павінен быць абаронены негаручым матэрыялам шырынёй не менш чым паўметра і даўжынёй не менш чым 0,7 метра. Складваць дровы, а таксама размяшчаць на ім гаручыя рэчывы і матэрыялы не дапускаецца. Не выкарыстоўвайце дровы, якія перавышаюць памер палення. Трымайце на бяспечнай адлегласці ад печы адзенне, мэблю, дровы, іншыя гаручыя матэрыялы. Попел варта выкідваць у спецыяльна адведзенае месца на бяспечнай адлегласці ад збудаванняў.

Акрамя таго, штогод перад ацяпляльным сезонам неабходна правяраць спраўнасць печы і дымавых труб (каналаў). Не забывайцеся іх перыядычна (не радзей чым раз на год!) чысціць ад сажы. Печы, паверхні труб і сцен, у якіх праходзяць дымавыя каналы, павінны быць спраўныя, без скразных расколін. Для таго каб вызначыць іх на ранняй стадыі, перад эксплуатацыяй комін рэкамендуецца абтынкаваць і пабяліць.

Выкананне правіл пажарнай бяспекі зберажэ ваша жыццё ў перыяд ацяпляльнага сезона, і вы зможаце спакойна атрымліваць асалоду ад цяпла хатняга ачага ў халодны вечар.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва МНС.**

### ПРЫ ЭКСПЛУАТАЦЫІ ПЕЧАЎ НЕ ДАПУСКАЕЦЦА:

— іх пераграваць;

— ажыццяўляць паленне пры наяўнасці абвальвання кладкі;

— прымяняць для распальвання вогненебяспечныя і гаручыя вадкасці;

— паліць у печы з адчыненымі дзверцамі, за выключэннем выпадкаў, калі канструкцыя прадугледжвае паленне з адчыненай камерай;

— размяшчаць гаручыя рэчывы і матэрыялы на іх, а таксама ў непасрэднай блізкасці ад адтулін для палення;

— распальваць вугалем, коксам або газай печ, непрызначаную для гэтых відаў паліва;

— пакідаць без нагляду печ, якая выкарыстоўваецца.

Анонс



## З МІНСКА — У НУРСУЛТАН

**З 30 верасня да 4 кастрычніка пройдуць Дні культуры Беларусі ў Казахстане. Мінулы раз падзея падобнага кшталту адбылася ў 2014 годзе.**

У праграме беларуска-казахстанскага свята — гала-канцэрт з удзелам заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь Жанэт, Аляксандра Саладухі, Алены Ланской, а таксама заслужанага калектыву Беларусі Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Беларусі, групы «Аўра». Пройдуць і Дні беларускага кіно, якія адкрые дэманстрацыя мастацкага фільма «Лёс дыверсанта».

У Нацыянальным музеі Казахстана будзе разгорнута выстаўка жывапісу «Сучасная Беларусь вачыма маладых мастакоў». Беларускую дэлегацыю ў час Дзён культуры ўзначаліць міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч.

Нагадаем, што ў Беларусі Дні культуры Казахстана праводзіліся ў 2009, 2013, 2018 гадах. За гады суверэнных лёсаў краін склаліся і выдатныя беларуска-казахскія гуманітарныя, літаратурныя, кнігавыдавецкія сувязі. Сёлета ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь былі прэзентаваны літаратурна-мастацкі альманах «Беларусь — Казахстан». У апошнія гады пісьменнікі Казахстана спрыяліся да ўдзелу на беларускіх пляцоўках у міжнародным круглым стале «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» (праводзіцца ў пярэдадзень Дня беларускага пісьменства, пачынаючы з 2007 года), Міжнародным сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час». У Мінску, іншых гарадах Беларусі пабывалі, сустрэліся з чытачамі пісьменнікі, кнігавыдаўцы Алжас Сулейменаў, Святлана Ананьева, Нурдаўлет Акыш, Райхан Мажэнкызы, Жанат Сейдуманаў, Кайрат Бакбергенаў, Любоў Шашкова, Мурат Аўэзаў... У Мінску пабачылі свет кнігі Абая, Мухтара Аўэзава ў перакладзе на беларускую мову.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Запрашальнік

## ВАС ЧАКАЕ «ЧЫСТЫ ЛЕС»

**У гэтым годзе акцыя будзе прымеркавана да Года народнага адзінства, ахопіць усе рэгіёны краіны і пройдзе 9 кастрычніка.**

На працягу дня валанцёры змогуць дапамагчы лясгасам у ліквідацыі несанкцыянаваных звалак, прыбіранні будаўнічых і бытавых адходаў, добраўпарадкаванні прыдарожных палос, а таксама лясных масіваў паблізу населеных пунктаў і памятных месцаў.

Стаць часткай акцыі можа любы ахвотны, для гэтага трэба звярнуцца ў найбліжэйшы лясгас або лясніцтва і заявіць пра сваё жаданне.

Як і ў папярэднія гады, асаблівы акцэнт у рамках акцыі плануецца зрабіць на рабоце з дзецьмі і карыстальнікамі сацыяльных сетак. Так, кожнае дзіця, якое прыме ўдзел у акцыі, атрымае ад лясгасаў невялікі сувенір. Каштоўныя падарункі чакаюць і аўтараў самых крэатыўных фота- і відэа, размешчаных у сацыяльных сетках пад хэштэгамі #ЧыстыЛес2021 і #ЧыстыйЛес2021.

Па інфармацыі прэс-службы Мінлясгаса, у 2020 годзе ўдзел у акцыі «Чысты лес» прыняла амаль 39 тысяч чалавек. Толькі за суткі валанцёры разам з работнікамі лясной гаспадаркі прыбралі каля 4,5 тысячы кубаметраў смецця і захламленасці, навялі парадак уздоўж прыдарожных палос, добраўпарадкавалі месца паблізу мемарыяльных комплексаў і памятных знакаў. Дадаткова было высаджана больш за 1,3 мільёна дрэў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (одним лотом)**
**Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1А**

| Наименование (назначение) | Общ. пл., кв. м. | Инвентарн. номер | Составн. части |
|---|---|---|---|
| **Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения** | 5375 | 640/С-1801 | Три навеса |
| **Железная дорога** | 254,2 м | 640/С-109925 | - |
| **Проходная** | 37 | 640/С-27612 | Навес |
| **Станция пожаротушения** | 100,8 | 640/С-27613 | Подвал |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **2,0419** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 486 074,00 бел. руб.** (снижена на 3 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Оплата предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дня с момента подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.08.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 14.10.2021 г. в 11.00. Окончание торгов: 14.10.2021 г. в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.10.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06**
**E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «ГлобоКарт», г. Минск, пл. Свободы, д. 17, пом. 734б** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| ***807*** | Грузовой фургон IVECO EUROCARGO | 15 000,00 бел. руб. |
| ***808*** | Грузовой фургон IVECO EUROCARGO | 15 000,00 бел. руб. |

**расположенные по адресу:**
Минская область, г. Узда, ул. Колхозная, 5А

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен единственным участником ООО «ГлобоКарт»

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг»», размещенным по адресу: www.torgi24.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 03.11.2021 г.** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 03.11.2021 г.** в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: 01.11.2021 до 17.00** на ЭТП ООО **«Расантехторг»** по адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «ГлобоКарт», г. Минск, пл. Свободы, д. 17, пом. 734б** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| ***781*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6690 | 753,13 бел. руб. |
| ***782*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6691 | 753,13 бел. руб. |
| ***783*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6689 | 753,13 бел. руб. |
| ***784*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6684 | 753,13 бел. руб. |
| ***785*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6688 | 753,13 бел. руб. |
| ***786*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6668 | 753,13 бел. руб. |
| ***787*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6661 | 753,13 бел. руб. |
| ***788*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6662 | 753,13 бел. руб. |
| ***789*** | Катамаран «Жук» (велосипед водный) четырехместный БМ 6665 | 753,13 бел. руб. |
| ***790*** | Велосипед водный «Чиж-М» БМ 6638, заводской № 401 | 502,09 бел. руб |
| ***791*** | Велосипед водный «Стриж», б/н, дата постройки 19.07.17, зав. № 4 | 502,09 бел. руб. |

**расположенные по адресу:**
Минская область, г. Узда, пер. К. Маркса, 12

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр. Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен единственным участником ООО «ГлобоКарт»

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг»», размещенным по адресу: www.torgi24.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **1000,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 27.10.2021** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 27.10.2021** в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: 25.10.2021 г. до 17.00** на ЭТП ООО **«Расантехторг»** по адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Криница», г. Минск, ул. Радиальная, 52** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет повторных электронных торгов**
**Месторасположение: г. Минск, ул. Радиальная, 52**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Легковой универсал Ford Escort**, рег. знак 8202 МА-7, 1997 г. в., инв. № 19656 | 884,80 |
| 2 | **Грузовой фургон «Пежо Партнер»**, рег. знак АА 7154-7, 2006 г. в., инв. № 12371 | 2 527,20 |
| 3 | **Седельный тягач МАЗ 64221**, рег. знак КВ 1169, 1991 г. в., инв. № 2724 | 3 013,20 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 (десять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам опубликовано в газете «Звязда» 09.09.2021 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Начало торгов в 11.00 12.10.2021 г.**
**Окончание торгов в 13.00 12.10.2021 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.10.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Уважаемые акционеры

# ОАО «МАПИД»!

**Внеочередным общим собранием акционеров Общества от 24 сентября 2021 года установлены следующий порядок и сроки выплаты дивидендов:**

- на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Фрунзенского района г. Минска – не позднее 22.10.2021;
- работникам Общества, юридическим лицам – путем перечисления на расчетные счета – не позднее 30.11.2021;
- физическим лицам, не работникам Общества – путем перечисления через депозитарий «Лидеринвест» с последующей выплатой; по заявлению акционера – почтовым переводом – не позднее 30.11.2021;
- физическим лицам, не работникам Общества, имеющим право на стандартные вычеты по подоходному налогу, – по заявлению акционера путем перечисления на электронные карточки – не позднее 30 11.2021.

Установленный размер дивидендов на одну акцию за I полугодие 2021 года составляет 0,2 649 636 руб.

Депозитарий ЗАО «Лидеринвест» располагается по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 41, оф. 512.

При обращении в депозитарий при себе иметь документ, удостоверяющий личность.

**Администрация**

УНП 100008115

**Могилевский филиал**
## РУП «Институт недвижимости и оценки»
**информирует о проведении 15.10.2021 г. открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Компания «МогНат»**

**Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – Котельная**, пл. – 687,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – Мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – Склад**, пл. – 44,2 кв. м. **Емкость металлическая 80 м³,** инв. № 5283; **Участок наружной канализации протяженностью 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642).

Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота не выделен.

***Начальная цена продажи: 111 072,00 бел. рублей с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 11 107,20 бел. руб.***

**Аукцион состоится 15 октября 2021 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-3357 (назначение – здание нежилое, наименование – охотничий домик), общей площадью 58,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее дер. Юровичи. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423683000044000001, площадью 0,0613 га (назначение – для обслуживания охотничьего домика) по адресу: Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее дер. Юровичи.**

Начальная цена продажи лота – 8 874 руб. (восемь тысяч восемьсот семьдесят четыре рубля) с учетом НДС.
Сумма задатка – 444 руб. (четыреста сорок четыре рубля)

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона затрат Продавца по уплате вознаграждения Организатору торгов в размере 5 % от конечной цены продажи объекта

**Продавец – Открытое акционерное общество «Лидский завод электроизделий», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 4, тел. 8-0154-52-13-47**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 октября 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.03.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 15 октября 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1857339, 1848227, 1848228.

УНП 100782388

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# СТРЫМАЦЬ ЭПІДПРАЦЭС

## Як ва ўмовах пандэміі працуе санітарна-эпідэміялагічная служба



**Заўтра санэпідэмслужбе нашай краіны спаўняецца 95 гадоў. Хоць яе правобразы — медыка-санітарныя бюро, санітарна-эпідэміялагічныя пададдзелы, дэзынфекцыйныя і прышчэпачныя атрады — з'явіліся значна раней 1926 года. Незаўважная для абывацеля ў мірныя часы, санітарна-эпідэміялагічная служба выходзіла на першы план у ваенныя і пасляваенныя гады, а таксама ў перыяды, калі бушавалі эпідэміі і пандэміі. І сёлетні 95-гадовы юбілей медыкі адзначаць у зусім няпросты час. З моманту распаўсюджання каранавіруснай інфекцыі ўрачы-эпідэміёлагі, вірусолагі, мікрабіёлагі і іншыя спецыялісты правялі сотні тысяч эпідрасследаванняў і тэстаў, супрацоўнікі тэрытарыяльных цэнтраў па ўсёй краіне першымі навведаліся ў ачагі хваробы і праводзілі дэзынфекцыю... Аб рабоце ў надзвычайных умовах мы паразмаўлялі з намеснікам галоўнага ўрача Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірынай МІЛАНОВІЧ.**

***— Ірына Уладзіміраўна, падчас пандэміі роля санэпідэмслужбы аказалася вельмі важнай. Эпідэміёлагі разам з іншымі медыкамі выйшлі на пярэдні край барацьбы...***

— Калі казаць пра ролю санітарна-эпідэміялагічнай службы, то, як паказвае гісторыя, яе значнасць заўсёды станавілася відавочнай падчас распаўсюджвання розных інфекцыйных захворванняў. Яны з цягам часу мяняюцца, некаторыя знікаюць, многія сталі вакцынакіраванымі, але ў свой час менавіта высокая інфекцыйная захваральнасць і звязанае з гэтым пагаршэнне здароўя насельніцтва сталі штуршком для стварэння санэпідслужбы. Аналізаваць захваральнасць і выяўляць яе, прапаноўваць і прымаць меры, працаваць у ачагах хвароб, праводзіць дэзынфекцыю, дэратызацыю, сачыць за бяспекай харчовых прадуктаў і пітной вады, санітарным станам тэрыторый — усё гэта было актуальным на той час. Цяпер, калі пра многія інфекцыі забыліся, на пярэдні план выйшаў COVID-19. Усім прыйшлося згадаць, для чаго першапачаткова ствараўся санэпідслужба. І лабараторыі, і персанал, і эпідэміёлагі, і вірусолагі — усе мы знаходзімся ў стане пастаяннай гатоўнасці да работы з інфекцыйнымі агентамі, але такой пандэміі, сапраўды, не чакаў ніхто. Прыйшлося аператыўна перабудоўваць работу ўсяго калектыву.

***— Наколькі я ведаю, на пачатку пандэміі супрацоўнікі вашай лабараторыі, якая займалася тэстамі на каранавірус, працавалі нават кругласутачна...***

— Так, адной з першых у пандэмію ўключылася лабараторыя Мінскага абласнога цэнтра. Спачатку вірусалагічнае падраздзяленне, пасля да яго далучыліся супрацоўнікі мікрабіялагічнага, паколькі рабочых рук не хапала. У пачатку пандэміі даводзілася працаваць і ў начныя змены, і без выхадных. Абсталяванне функцыянавала не так хутка, як хацелася б. Стала відавочна, што неабходна новае — больш сучаснае і хуткае, і Міністэрства аховы здароўя нас падтрымала. Цяпер у нашай лабараторыі зусім іншыя магутнасці і хуткасці. Калі раней правядзенне лабараторнага даследавання магло займаць суткі, то сёння атрымліваем вынік даволі хутка. Калі мазок здаюць у першай палове дня, то ў другой гатовы вынік.

***— Таксама супрацоўнікі санэпідслужбы выязджаюць на апрацоўкі інфекцыйных ачагоў...***

— Так, найперш гэта датычыцца закрытых калектываў, калі там здарылася ўспышка. Як правіла, чалавек шпіталізуецца ці пераводзіцца ў іншую палату, а тое месца, дзе ён знаходзіўся, падвяргаецца заключнай дэзынфекцыі.

У нас, дарэчы, узмацніўся і гэты блок. Дзякуючы намаганням галоўнага ўрача і садзейнічанню аблвыканкама тэрытарыяльныя цэнтры гігіены — а ў нас у Мінскай вобласці іх 23 — аснасцілі транспартам для больш аператыўнай работы, бо выязджаць прыходзіцца і ў сельскую мясцовасць. У кожным тэрытарыяльным цэнтры з'явіўся новы аўтамабіль.

***— Яшчэ адзін важны аспект работы — санэпідрасследаванні...***

— Мала вызначыць дыягназ — важна выявіць кола кантактных асоб і прыняць меры па стрымліванні эпідпрацэсу і нераспаўсюджванні інфекцыі. Натуральна, у працэсе работы мяняліся і крытэрыі. На піку першай хвалі здавалася, што ўсе мусяць быць кантактамі першага ўзроўню, вельмі шырокі быў дыяпазон кантактаў другога ўзроўню. Гэта была новая нявывучаная інфекцыя, і ўсе меры максімальна скіроўвалі на тое, каб падстрахавацца, засцерагчы насельніцтва і стрымаць эпідпрацэс.

Сёння ў асноўным мы маем справу з першым узроўнем кантактаў, і іх кола, як правіла, зводзіцца да членаў сям'і. Аказваюць сваё дзеянне абмежавальныя мерапрыемствы — масачны рэжым, сацыяльнае дыстанцыраванне. У многіх працоўных калектывах, як правіла, масачны рэжым захоўваецца. Таму такога шырокага кола кантактаў ужо няма.

І, тым не менш, гэта вялікія аб'ёмы інфармацыі. У разгар пандэміі мы прыцягвалі старшакурснікаў медыкапрафілактычнага факультэта медуніверсітэта ў межах іх практыкі, яны вучыліся навыкам эпідрасследавання і істотна дапамагалі. Напрыклад, студэнты працавалі ў нашым Мінскім занальным цэнтры, бо рэсурсу нашых спецыялістаў не хапала. За гэта ім наша шчырая падзяка.

***— Нягледзячы на тое, што слова «эпідрасследаванне» чуў бадай кожны абывацель, мала хто ведае, як яно праводзіцца...***

— Гэта комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне крыніцы інфекцыі, кантактных асоб, устанаўленне шляхоў і механізмаў перадачы, фактараў, якія гэтаму спрыяюць, эпідэміялагічнага анамнезу, вызначэнне граніц распаўсюджвання захворвання, а таксама правядзенне дэзынфекцыі. Мы максімальна ўстанаўліваем кантакты і вядзём улік і назіранне. Інфармацыя аб кантактах перадаецца для кантролю за самаізаляцыяй у РУУС як з боку ўстаноў аховы здароўя, так і цэнтраў гігіены.

У цэнтр гігіены паступае экстраннае паведамленне, якое накіроўваецца па факце ўстанаўлення дыягназу. Там маюцца меркаваныя тэрміны, калі чалавек заразіўся, яго кантактныя даныя. І ўрач-эпідэміёлаг (а падчас пікавых перыядаў і ўрачы-гігіеністы) ці памочнік урача тэлефануюць пацыенту, робяць апытанне і запаўняюць спецыяльную форму. Такім чынам наладжваецца ўлік. Усё гэта дазваляе нам забяспечыць дынамічнае сачэнне. Калі чалавек не захварэў, то праз сем дзён, пасля заканчэння тэрміну самаізаляцыі, ён выходзіць на работу ці вучобу.

***— Інфармаванне насельніцтва аб мерах бяспекі — таксама задача эпідэміёлагаў?***

— Так, адукацыйную ролю і ўстаноў дзяржсанналгляду ніхто не адмяняў. Папярэджаны — значыць узброены, і наша задача — максімальна данесці да насельніцтва інфармацыю пра само захворванне, шляхі яго перадачы, пра небяспекі і меры барацьбы не толькі механічныя, такія як дыстанцыраванне, маскі, гігіена і рэспіраторны этыкет. У цяперашні час самае важнае — вакцынацыя. Яна з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных метадаў для кіравання і стрымлівання эпідпрацэсу. І кожны грамадзянін павінен разумець, што, вакцынуючыся, ён робіць унёсак, абараняючы і сябе, і сваю сям'ю, таксама фарміруе калектыўны імунітэт. Назіранні паказваюць, што сярод захварэлых у арганізацыях аховы здароўя прышчэпленых не больш за пяць працэнтаў. Такім чынам, эфектыўнасць вакцын у 95 % пацвярджаецца на практыцы. І цяжкіх форм сярод захварэлых, як правіла, няма.

***— Як можаце ахарактарызаваць чацвёртую хвалю каранавіруса?***

— Мы ўжо жывём ва ўмовах чацвёртай хвалі. І эпідэміялагічная сітуацыя ў Мінскай вобласці мае тыя ж тэндэнцыі, што і ў цэлым па краіне. Мы адзначаем рост захваральнасці. Гэта звязана як з прыходам новых штамаў, так і з пачаткам вучэбнага года. У гэты час заўсёды павялічваецца колькасць ВРВІ, а цяпер і каранавіруснай інфекцыі. Ну і людзі расслабіліся, няма належнага захавання мер сацыяльнага дыстанцыравання, масачнага рэжыму, пазбягання неабавязковых мерапрыемстваў і месцаў масавага збірання. Дарэчы, як паказаў мінулы сезон, у Мінскай вобласці не было зарэгістравана выпадкаў захворвання на грып. На мой погляд, тут свой унёсак зрабілі і масачны рэжым, і гігіена рук, і сацыяльнае дыстанцыраванне.

***— Ірына Уладзіміраўна, як за апошнія гады змяніліся ўмовы працы вашага калектыву?***

— Пра закупкі аўтатранспарту для тэрытарыяльных цэнтраў я ўжо згадвала. Акрамя таго, год таму адбылася рэструктурызацыя нашай лабараторыі, бо мы пашырылі яе плошчы ў Ратамцы. Цяпер працуюць свае лабараторыі ў такіх гарадах, як Барысаў і Салігорск, дзе выконваюць дыягностыку COVID-19 метадам ПЛР, іх таксама ўдалося аснасціць новым дыягнастычным абсталяваннем.

Некалькі гадоў таму пухавіцкі цэнтр гігіены завяршыў рэканструкцыю будынка і пераехаў. Пакуль у абмежаваных умовах працуе наш Мінскі занальны цэнтр гігіены, які размяшчаецца ў Бараўлянах. Але вядзецца работа над тым, каб палепшыць і яго ўмовы.

---

А вы ведалі?

# Рыба, яйкі, сонца: навошта нам вітамін D

**Тры чвэрці беларусаў пакутуюць ад недахопу вітаміну D. Каб атрымаць яго, варта гуляць у сонечны дні. Але некаторыя ўрачы сцвярджаюць, што аднымі прагулкамі запасы гэтага каштоўнага рэчыва не папоўніць. Спецыялісты кажуць, што для атрымання неабходнай чалавеку дозы вітаміну D трэба «смажыцца» на сонцы, а вось гэта ўжо небяспечна меланомай. Але адкуль жа тады атрымаць вітамін? Купляць спецыяльна абагачаныя ім прадукты? Налягаць на рыбу і яйкі? Ці гэта не вартая выедзенага яйка сенсацыя ад маркетолагаў?**

## Навошта і каму ён патрэбны?

Раней самым важным называлі вітамін C, а цяпер усе паўтараюць пра вітамін D. З чаго ён раптам стаў такім важным? Справа ў тым, што за дзесяцігоддзі даследаванняў навукоўцам адкрыліся тонкасці засваення, дакладней, незасвоення вітаміну C і тое, што ён зусім не панацэя для імунітэту. І за гэты ж час высветлілася, што вельмі шмат функцый арганізма звязана з іншым вітамінам — D, без якога і кальцый з фосфарам не засвойваюцца нармальна, і рак малочных залоз у жанчын узнікае часцей. А для мужчын недахоп гэтага рэчыва можа абярнуцца ракам тоўстай і прамой кішак. І гіпертанія — прадвеснік небяспечных сардэчна-сасудзістых захворванняў — часцей сустракаецца ў тых, хто вітаміну D недаатрымлівае.



А жанчыны ва ўзросце менш таўсцеюць, калі атрымліваюць дастаткова вітаміну D. У адрозненне ад вітаміну C вітамін D выпрацоўваецца самім арганізмам. Хоць менавіта ў гэтым, здаецца, і ёсць галоўны яго мінус.

Вітамін D выпрацоўваецца ў клетках скуры пад уздзеяннем сонечных прамянёў. Гучыць проста, але ёсць нюансы. Прамяні павінны трапляць на скуру пад прамым вуглом. Па гэтай прычыне жыхары паўночных краін адчуваюць дэфіцыт вітаміну D.

Навукоўцы кажуць так: калі цень стаў даўжэй за рост, то ад такога сонца вітаміну D ужо не атрымліваеш. І дарэчы, «вітамінам» яго называць не зусім дакладна, настойваюць многія навукоўцы. Гэта хутчэй стэроідны гармон, а літара D — зборная і пазначае цэлае сямейства біялагічна актыўных рэчываў.

## Ці можна назапасіць?

Назапасіць вітамін D і праўда можна: ён адносіцца да класа тлушчарастваральных. Гэта значыць, у адрозненне ад водарастваральнага вітаміну C ён не распадаецца ў арганізме за некалькі гадзін, а можа асядаць у тлушчавых тканках і там заставацца нязменным да двух месяцаў. Па меры неабходнасці арганізм будзе яго выкарыстоўваць. Толькі дэфіцыт вітаміну D з-за такога доўгага шляху выяўляецца не адразу, а калі ў арганізме яго ўжо крытычна мала.

Ад сонца вітаміну D можна атрымаць неабходную сутачную колькасць усяго за 30 хвілін. Праблема ў тым, што патрэбнае выпраменьванне дае тое самае паўдзённае сонца ў зеніце, якое гэтак часта заканчваецца апёкамі ў першы дзень адпачынку. Таму скуру трэба берагчы. У салярыі вітамін D выпрацоўваецца таксама, але тут вельмі лёгка перабраць, скарыстаўшыся пратэрмінаванымі лямпамі. А гэта прамы шлях да раку скуры і праблем з вачыма.

## Налягаем на рыбу

Кажуць, што вітаміну D шмат у рыбіным тлушчы. Ці так гэта? Ці працей купіць таблеткі-вітаміны?

Рыбін тлушч не ўсе любяць, затое яго можна атрымаць з дзікай чырвонай рыбы, у ста грамах якой утрымліваецца паўтары мінімальныя дзённыя дозы (165 %) вітаміну D. У такой жа порцыі ласасёвых рыб, вырашчаных штучна, вітаміну D у чатыры разы менш. Яшчэ вітамінам D багатая печань траскі: 1 сталовая лыжка змяшчае тры дзённыя нормы, а таксама шмат гэтага гармону ў дзікіх крэветках. Хоць значна танней налягаць на селядца: у ста грамах марынаванай рыбы ўтрымліваецца дзённая норма вітаміну D. А ў жаўтку аднаго яйка курыцы з птушкафабрыкі сем працэнтаў вітаміну D ад дзённай нормы. А калі курыца бегае па двары пад сонейкам, то вітаміну D у яе яйках у чатыры разы больш: адно яйка змяшчае 25 % дзённай нормы.

Вітамін прадаецца практычна ў любой аптэцы і засвойваецца не горш, чым вітамін D, які знаходзіцца ў прыродных прадуктах, такіх як рыбін тлушч або яйкі. Зімой у складзе мультывітамінных прэпаратаў вітамін D не перашкодзіць нікому.

## Чым больш, тым лепш?

Пры ўсёй сваёй неабходнасці і карыснасці вітамін D і праўда таксічны. І яго лішак можа выклікаць стандартныя пры атручванні рэакцыі: млоснасць, слабасць, страту апетыту. Калі вітаміну D шмат, то кальцый настолькі добра засвойваецца, што яго канцэнтрацыя ў крыві не лепшым чынам уплывае на работу сэрца і на здольнасці канцэнтраваць увагу.

# «Жыгулі» ўжо аджылі,

## Ім на змену — «Джылі»?..



**Статыстыка ведае ўсё (ну, ці амаль): варта пацікавіцца, і яна вам лёгка падкажа, што ў нашай краіне жывуць прадстаўнікі 130 народаў і народнасцяў: беларусы, рускія, украінцы, палякі... Дакладна падлічана, колькі каго. Загадкай хіба тое, чаму пра адных і пішуць, і кажуць проста — малдаванін, літовец, узбек, мангол, а пра іншых — цэлай слоўнай канструкцыяй: чалавек яўрэйскай нацыянальнасці, чалавек каўказскай...**

Дык вось якраз пра яго — і з першых вуснаў, можна сказаць.

Закахаўся, значыць, адзін каўказец у нашу Наташу і чаго толькі ні рабіў: кветкі-падарункі прыносіў, у тэатры і кіно запрашаў, у рэстараны вадзіў... А замуж стаў клікаць — не ідзе і ўсё тут....

Ён тады што надумаў — загрузіў свае «Жыгулі» рознай выпіўкай-закускай — і ў вёску, да бацькоў дзяўчыны. Так і так, гаворыць ім на дрэннай рускай, жыць не магу без вашай Наташы! Богам прашу: аддайце замуж! А ўжо я — і для вас, і для яе — проста горы звярну!

Гаворыць так, рукамі размахвае, слёзы выцірае, нават на калені парываецца стаць — гаспадары не даюць... Не ўсё з яго слоў яны разумеюць, але ж слухаюць, спагадаюць. А пасля нейкай чаркі ўжо і самі яму гавораць (па-нашаму, па-беларуску), што хлопец ён, відаць, неблагі, што з дачкой яны пагавораць — можа, пераканаюць... «Але ж май на ўвазе: крый божа потым пакрыўдзіш...»

Вось гэтае грознае «май на ўвазе, а то не пацярплю — галаву знясу!..» бацька разоў з дзесяць паўтарыў (а то і болей). Госць сказаў, што ўсё зразумеў.

І сапраўды: недзе праз тыдзень зноў прыехаў і ўжо не на ВАЗе, (калі ўжо бацька так не любіць гэтых машын), а на «БМВ»...

Вось такая была гісторыя.

На здымку (можна яшчэ раз глянуць не верхні), відавочна, нейкая іншая? А вось якая?

Наша задача — прадставіць усе, што даслалі чытачы. Ім жа (то-бок вам) — пасля вызначаць найлепшую. Такім чынам, стартуем: наперад у мінулае.

«Ёсць анекдоты, — сцвярджае **спадар Іван Астроўскі з Мінска**, — якія помніш гадамі. Здымак нагадаў мне вось гэты: на дарозе сутыкнуліся, ды што там — разбіліся тры машыны. «Я цэлае лета на сваю зарабляў!» — вохкае ля «таёты» мужчына каўказскай нацыянальнасці. — «Мы з Сарай цэлы год эканомілі», — гаруе мужчына яўрэйскай... — «А я, — плача беларус, пазіраючы на тое, што засталося ад «запарожца», — усё жыццё на гэту машыну паклаў!..» — «Слухай: на халеру такую браў? — спачуваюць сябры па няшчасці. — Можна ж было таннейшую?»

І нават трэба!.. Хоць бы для таго (на думку **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**), каб адчуваць сябе чалавекам, каб аўтарытэт узняць — яшчэ і ў вачах дзяцей:

*Татка наш купіў аўто!*
*Ён цяпер не абы-хто:*
*Ён кіроўца, ён персона!*
*Хоць машына — не з салона,*
*А з дзясятых, можа, рук, —*
*Нос па ветры. І ў гару!*

І потым з форсам (паводле **спадара Мікалая Старых з Гомеля**):

*Бацька — дзецям:*
*— Ёсць аўто!*
*Конскіх сіл у ім — пад сто...*
*Дзеці:*
*«Як тут веры даць,*
*Калі коней — не відаць?!*
*Ні загрыўка, ні хваста —*
*Аднаго...*
*А дзе ўжо ста?!»*

Вось па гэтай прычыне каму-нікаму з малых (можна яшчэ раз паглядзець на здымак) і нецікавая ўжо машына. Іншая справа — дарослыя, якія ведаюць, што

*Па капейцы, цяжка, горка*
*Ясь адкладваў на «шасцёрку»...*
*А купіў — ахвотных... рота*
*Глянуць:*
*што ж там пад капотам?*
*Можа, золата навалам?*
*Калі столькі каштавала?*

Зрэшты, машыну можна ж не толькі набыць. Як заўважыла **спадарыня Зоя Наваенка з Глыбоччыны**, цуды — і цяпер, і некалі — таксама здараліся:

*Ажаніўся Ясь на Зосьцы...*
*Ўся ваколіца зайздросціць!*
*Жаль — не дзеўка тут прычынай:*
*У пасаг даюць... машыну!*

Было. А яшчэ і такое:

*Ясь да цешчы крочыў пешшу,*
*Нёс гасцінцы, падмацунак,*
*Чым свавчку так усцешыў, —*
*«Жыгулі» у падарунак!*
*...Што да гэтага дадаць?*
*Трэба цешчу шанаваць!*

А яшчэ — сумленна, з аддачай працаваць, што, паводле **спадарыні Наваенкі**, таксама выгадна. Ну вось самі «ўбачце»:

*З вокнаў зырылі суседзі —*
*На машыне (?) Рома едзе?*
*— Быць не можа, каб прыдбаў!*
*— Мо пазычыў?*
*— Ну не ўкраў!..*
*— На пракат узяў — у цёткі...*
*Не пляціце, людцы, плёткі:*
*На камбайне першым стаў —*
*«Жыгулі» і атрымаў.*

Была такая практыка. Запіска на машыне, кажуць, таксама. Прычым хутка з'явілася: калі вам, маўляў, замінае гэты аўтамабіль, пазваніце. І следам нумар...

Набраць яго вельмі многім хацелася, каб сказаць, што машына — ужо дастала... Бо на вачах, харошая, новая, а галоўнае — дармавая... Каго тут жаба не заесць, каму не захочацца такую ж?

Ці іншую? Бо вось гэта, як піша **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў**,

*Вельмі файная машына:*
*Усё на месцы, чын па чыну.*
*І бензіну поўны бак*
*А завесці... Ну ніяк!*

Бывае, на жаль, як піша **спадар Эльяш Банель з Мінска**:

*Падняў капот у «Жыгулях»*
*І...*
*Вочы б не глядзелі:*
*Ну ўсё развaліцца па «швах»*
*У першую ж нядзелю!*

І тады...

*Ясь не скажа вам дакладна,*
*Колькі ездзіць гэта «лада»*
*Але ж бачна — «Жыгулі»*
*«Падманулі, падвялі»:*
*Хтось нясецца міма з шыкам,*
*А яго паездка — пшыкам...*

Пішуць так **сужэнцы Астроўскія** і тым самым нагадваюць старое: «Не разумею, чым не падабаюцца айчынныя машыны? Немцы вунь на айчынных ездзяць, і нічога». А вось расіяне... Ды і мы... Як піша **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны**:

*«Ладу» хто купяе, —*
*Розуму не мае:*
*Каб яе рамантаваць,*
*Трэ кансіліум збіраць.*

І потым ездзіць па аўтарынках, аўтакрамах, аўтасэрвісах: для чаго, як кажуць, гэтыя машыны і ствараюцца.

У аднаго з уласнікаў, дарэчы, спыталі, хто ў яго сям'і найдаражэй абходзіцца? Шчыра адказаў: «Лада» — і чым далей, тым болей», што, вядома ж, не пра жонку... А таму на здымку, паводле **спадарыні Гудачковай**, можа быць «кансіліум» і з іншай нагоды:

*Лёс жалезнага каня*
*Вырашае ўся радня:*
*Ці прадоўжыць яму жытку,*
*Ці ўжо выкінуць з ужытку?*

Вось гэта, апошняе, хто-ніхто зрабіў. І таму (згадзіцеся са **спадаром Мікалаем Касмачэўскім з Наваполацка**):

*«Жыгулёнкаў» на дарогах*
*Сёння ўжо не так і многа...*
*А малым жа цікавей,*
*Што тут ездзіла раней?*
*Пройдзе час, і рарытэтам*
*Можа стаць машына гэта.*

(«У вас ёсць хобі?» — спыталі неяк у каўказца. — «А як жа! — пахваліўся ён. — Я збіраю вазы!». — «Якія?» — «2101», «2102», «2103»...

Бо яны, калі па шчырасці, заўсёды ў пашане. І, вядома ж, нездарма. Вось уявіце: чалавек у дарозе, канца ёй пакуль не відаць... Ён галасуе, ды «мерседэсы»-«таёты» праносяцца міма. І толькі старая «капейка» спыняецца, падбірае — чалавек едзе, яму цёпла, добра...

Хоць, здараецца, і не вельмі. Знаёмец неяк на сваім «крузаку» (гэта, казаў, машына мары: хто не мае, марыць купіць, хто мае — прадаць...) падвозіў купку турыстаў, па-беларуску распытваў іх, дзе вучацца, куды ідуць, расказаў ім пра тое месца... (Хлопцы неспадзеўкі зразумець не маглі, дзе яны, куды патрапілі?)

...**Спадар Касмачэўскі**, здаецца, ведае, чаму такое здараецца: таму што дзеці адарваныя ад жыцця: за сваімі гаджэтамі свету не бачаць! А дарослым часам і справы няма... Хоць на добры толк вельмі трэба было б нешта прыдумаць. Ну вось як на здымку:

*Каб улетку нашы дзеткі*
*Не сядзелі ў хатах-клетках,*
*Школьны стораж, дзед Макар,*
*Зладзіў творчы семінар:*
*«Жыгулёнка» разабраў —*
*Расказаў і паказаў,*
*Дзе матор, дзе радыятар,*
*Як працуе генератар...*
*Быў карысным дыялог:*
*Дзед — сапраўдны педагог!*

Трэба разумець, не Макар, а ледзь не Макаранка: можа перадаваць свае веды і не сумнявацца ў тым, што яны спатрэбяцца, бо часам (як разважае **спадар Сабалеўскі**),

*Дзе якія тут масты?*
*Дзе акумулятар?..*
*Хоча з тэхнікай на «ты»*
*Быць дзяцюк-аматар:*
*Ён пайдня іскру шукаў*
*Пад сядзеннем дзесьці...*
*«Жыгулёк» карчом стаяў:*
*Падкажыце, дзеці!*

А яны (калі вучні Макаранкі) гэта змогуць...

Той знаёмец з «крузака» расказваў, напрыклад, што змалку ганяў на матацыкле. Пакуль не зламаў... І да бацькі: дапамажы?.. А таму, відаць, лянота была: інструкцыю сыну ў рукі і... «Давай, брат, сам». Малы пакрыўдзіўся, але справу зрабіў — нават смак адчуў: стала цікавей катацца — тады... Цяпер свой бізнес у яго.

Ці трэба казаць, што па-рознаму ён пачынаецца. У вось гэтага ўладальніка «Жыгулёў», паводле **спадара Сабалеўскага**, — з гандлю:

*Каму піва? Каму «жуйкі»?*
*Цыгарэт ці хлеба?..*
*Калі ты не Абрамовіч,*
*То круціцца трэба:*
*Не «шасцёрка» — аўтакрама*
*Летам у Фядота.*
*Не патрэбна і рэклама:*
*Файная работа!*

І, дай бог, выніковая, бо гэты Фядот сам сабе і дырэктар, і бухгалтар, і рэвізор... Карацей — зусім не тое, што на здымку, які **спадара Сабалеўскага** «падбіў» на роздум:

*Часу мала ў запасе*
*Ды і той ад нас бяжыць...*
*Як калісьці ў калгасе:*
*Нехта робіць, сем — глядзіць:*
*Адзін слесар, тры дарадцы,*
*Плюс праверка...*
*Ніадкуль...*
*Ад такой «разумнай» працы*
*Адпаведны й вынік — нуль.*

Але ж гэта, дай бог, не пра нашу краіну, бо тут (паводле **сужэнцаў Астроўскіх**),

*«Жыгулі» ўжо аджылі,*
*Ім на змену — «Джылі».*
*Усё болей ім дарог!*
*І...*
*да новых перамог —*
*Электрамабіляў!*

Як той казаў: дай бог нашаму цяляці воўка з'есці. Ці пачутае — убачыць, што, на думку **спадарыні Гудачковай**, натоўп (са здымка) і робіць:

*Чуткі — мігам: «Там купілі*
*Электрычнага мабіля!»*
*Паглядзець на цуда дня*
*Пазбягалася радня.*

З іншай мэтай, як піша **спадарыня Кусянкова**, яна таксама магла:

*У натоўпу «гледачоў»*
*Не хапае ўжо мазгоў...*
*Выглядае ўсё ў парадку:*
*Ёсць іскра і ёсць зарадка...*
*Чаму ж «Лада» не імчыцца?*
*Сонька знае ды маўчыць:*
*Бак з натугай адкруціла,*
*А бензін... падсаладзіла!*

Ды што там — і паспытаць магла: дзеці ж народ цікаўны. І чым больш іх у сям'і — тым лепш. А значыць,

*На вяселле «Жыгулі»*
*Падарылі госці.*
*І тым самым... падвялі*
*Бацькоў-ягамосця,*
*Бо ў машыне —*
*«крэслаў» пяць,*
*А малых —*
*«штук» сем, відаць?*
*Плюс, вядома ж, маці...*
*МАЗ бы падагнаці!*

Раіць гэта **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**, маючы на ўвазе аўтобус на 25 пасадачных месцаў. Ну, каб з запасам было. А то...

*Колькі дзетак у салоне,*
*Відавочна: не злічыць.*
*Вось «жыгуль» таму і стогне:*
*Адмаўляецца вазіць, —*

лічыць **спадарыня Таццяна Новік з Клецка**. А МАЗ, вядома ж, павязе, прычым любую сямейку!

Значыць, дай бог кожнаму — вялікую і дружную, у якой хоць святкаваць, хоць гараваць — усё лягчэй...

Як і нешта рабіць: дапусцім — падводзіць вынікі нашага конкурсу на найлепшы подпіс да здымка. Такім чынам на ім, папярэднім (глядзі нумар «Звязды» за 21 ліпеня), быў «плывец» з чарадой гусей. Дык вось, найлепшыя радкі аб тым, куды плыў ён, куды яны, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, прыдумалі **спадары Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка, Валерый Гаўрыш з Чавусаў**, а таксама **спадарыні Зоя Наваенка з Глыбоччыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны і Таццяна Новік з Клецка.**



Вось з гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае, рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал 2022 года накіроўваецца ў горад Клецк...

Марыце, каб газета пяць разоў на тыдзень прыходзіла і да вас? Тады выпісвайце альбо ў чарговы раз уважліва пагледзіце на новы конкурсны здымак, прыдумайце подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, памерам не больш чым восем радкоў) і... выйграйце! Ці хоць бы паспрабуйце — раптам атрымаецца?

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

«Ціхае паляванне»

Кацярына ЦІШКЕВІЧ:

# «КАЛІ НЕ ВЕДАЕШ ГРЫБ, НЕ БЯРЫ!»



**Сезон грыбоў у самым разгары, і аматары дароў восені кожныя выхадныя спяшаюцца ў лес. І тут як на рыбалцы: пашанцуе — добра, калі не — не бяда. «Галоўнае — гэта працэс!» — упэўнена тэлевядучая АНТ Кацярына ЦІШКЕВІЧ. «Далёка не ўсе людзі ўмеюць збіраць грыбы і шчыра здзіўляюцца, як у іншых гэта атрымліваецца. На самай справе ўсё даволі проста. Перад тым, як ісці ў лес, даведайцеся пра характэрныя асаблівасці росту тых ці іншых грыбоў, а таксама пазнаёмцеся з атрутнымі відамі», — гаворыць тэлевядучая. Кацярына шчыра і з гумарам расказала, хто навучыў яе збіраць грыбы і падзялілася любімымі рэцэптамі грыбных страў.**



## УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З СЯМ'І

Збіраць грыбы мяне навучылі бацькі. Разам мы наведалі амаль усе грыбныя месцы на Случчыне. Памятаю, як з надыходам сезона матуля і тата бралі нас з братам з сабою ў лес. Для мяне гэта была цэлая падзея. Мы хапалі кошыкі, садзіліся ў машыну і дружна ад-праўляліся ў маленькае падарожжа. Тата заўсёды хадзіў па лесе адзін, я збірала грыбы побач з матуляй. Памятаю, як яна шчыра радавала-ся кожнаму знойдзенаму баравіку ці падасінавіку, як захаплялася іх прыгажосцю. Расказвала пра асаб-лівасці грыбоў, тлумачыла, якія з іх ядомыя, а якімі можна атруціцца. Грыбы мы збіралі розныя: лісічкі, баравікі, бабкі, падасінавікі, пад-бярозавікі, сыраежкі, зялёнкі, па-дзялёнкі, апенькі, ваўнянкі, груздзі. Кожнаму віду — свой час. У лесе я старалася быць вельмі ўважлівай, каб не прапусціць ніводнага гры-ба, бо сямейныя спаборніцтвы па колькасці і якасці сабраных грыбоў ніхто не адмяняў. Абавязковай фі-нальнай часткай ціхага палявання з'яўляўся пікнік у лесе. Памятаю, як смачна было есці на свежым павет-ры! На жаль, на гэтым самая пры-емная частка паездкі ў лес закан-чвалася. Прыехаўшы дамоў, трэба было дапамагаць матулі сартаваць, перабіраць і мыць грыбы. Скажу шчыра, жадання рабіць гэта як правіла не было. Чыстыя грыбы раскладваліся па каст-рулях і варыліся на працягу 1,5—2 гадзін. Водар у доме быў неверагодна прыемны! Стравы з грыбоў гатаваліся розныя. Лісічкі смажылі на алеі з цыбуляй і смятанай. Баравікі марынавалі або сушылі, каб дадаваць у кіс-лую капусту зімой. Ваўнянкі і грузды салілі.

## СЯМЕЙНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Мая любоў да лесу з гадамі не знікла. І ўжо я вучу сваіх дзяцей, ідучы па лесе, быць уважлівымі, умець знаходзіць грыбы і класці ў кошык толькі тыя, якія можна есці. Любімыя месцы для такіх вандровак — прыгожыя лясныя масівы Лагойшчыны. Зараз, як і ў дзяцінстве, паход па грыбы для мяне — гэта цэлы рытуал. Па-пер-



шае, патрэбна адпаведная экіпі-роўка: адзенне з тоўстай тканіны, гумовыя боты, галаўны ўбор. Не забыцца на спецыяльны кошык і маленькі ножык. Самыя любімыя грыбы — лісічкі. Нездарма іх так назвалі! Акрамя прыгожага яркага колеру, яны вельмі хітра растуць. Калі ўбачыў лісічку, трэба ўважлі-ва агледзецца вакол. Абавязкова заўважыш яшчэ і не адну. Калі па-шанцуе, то на адным месцы можна назбіраць аж палову кошыка! У та-кія моманты адчуваеш сапраўдны паляўнічы азарт! Пры зборы гры-боў я заўсёды карыстаюся адным важным правілам: калі не ведаеш грыб, не бяры!

## ЛЮБІМЫЯ ГРЫБНЫЯ СТРАВЫ

У маім дамашнім меню стра-вы з грыбоў займаюць ганаровае месца. Каб гастранамічнае задавальненне не залежа-ла ад сезона, рэкамендую нарыхтоўваць грыбы на зі-му. Самы просты спосаб — гэта замарожванне. Такія грыбы можна захоўваць на працягу года і гатаваць з іх усё, што заўгодна. Ну, а ка-лі запасы дароў лесу скон-чацца да пачатку наступна-га грыбнога сезона, можна набыць альтэрнатыўныя варыянты: шампіньёны ці дрэўнавушкі.

### Дранікі з лісічкамі і вяндлінай

Вам спатрэбіцца:
- ✓ бульба — 600 г;
- ✓ яйкі — 1 шт.;
- ✓ мука пшанічная — 2 ст. л.;
- ✓ цыбуля — 1 шт.;
- ✓ вяндліна — 100 г;
- ✓ лісічкі — 200 г;
- ✓ алей;
- ✓ соль.

Як гатаваць?

1. Бульбу абабраць, памыць, нарэзаць і разам з цыбуляй здраб-ніць у блендары.
2. Дадаць яйка, муку, соль. Змя-шаць.
3. Лісічкі зварыць і разам з вяндлінай дробна нарэзаць. Да-даць бульбяную масу. Змяшаць.
4. Смажыць дранікі на алеі з двух бакоў да залацістага колеру.

### Фаршыраваныя шампіньёны

Вам спатрэбіцца:
- ✓ шампіньёны — 10 шт.;
- ✓ сыр — 50 г;
- ✓ вяршкі — 40-50 мл;
- ✓ мука — 1 ст. л.;
- ✓ часнок — 1 зубок;
- ✓ соевы соус;
- ✓ чорны молаты перац;
- ✓ соль.

Як гатаваць?

1. Шампіньёны памыць і пра-сушыць. Выдаліць ножку і зняць лупіну.
2. Заслаць форму для запякан-ня пергаментам і палажыць капя-люшыкі грыбоў.
3. У кожны капялюшык наліць крыху соевага соуса.
4. Ножкі шампіньёнаў дробна нарэзаць. Смажыць на алеі на працягу пяці хвілін. Дадаць час-нок, соль і перац.
5. Наліць у патэльню з грыба-мі вяршкі, дадаць муку. Змяшаць і тушыць на маленькім агні яшчэ тры хвіліны.
6. Пакласці начынне ў капялю-шыкі шампіньёнаў і пасыпаць цёр-тым сырам.
7. Запячы грыбы ў духоўцы.

### Гароднiна з грыбамі

Вам спатрэбіцца:
- ✓ грыбы дрэўнавушкі (ці лясныя грыбы) — 250—300 г;
- ✓ перац балгарскі — 1 шт.;
- ✓ морква — 1 шт.;
- ✓ маладыя кабачкі — 2 шт.;
- ✓ памідоры — 2 шт.;
- ✓ соль, часнок, спецыі на смак;
- ✓ кінза;
- ✓ насенне белага кунжуту.

Як гатаваць?

1. Грыбы і гародніну па чарзе абсмажыць на алеі на працягу пяці хвілін. Пакласці ў мультывар-ку. Дадаць часнок.
2. Тушыць 25 хвілін. Пасаліць, дадаць спецыі.
3. Палажыць на сервіровачную талерку, пасыпаць пасечанай кін-зой і насеннем кунжуту.

**Прыемнага апетыту!**

---

Фестывалім!

# Жураўлі клічуць, трэба ісці!

## На Мёршчыне прайшло экалагічнае свята

**На Мёршчыне ёсць вельмі прыгожае і эка-лагічна ўладкаванае месца, якое даспадобы не толькі людзям, але і жураўлям, — гэта ча-роўны заказнік Ельня, адзін з найбольшых комплексаў балот са шматлікімі маляўнічы-мі азёрамі.**



Жураўлі спыняюцца там падчас восеньскай міграцыі, спецыялісты налічваюць іх больш за 35 тысяч! Шмат людзей прыязджае на свя-та з усіх куткоў Беларусі, каб пакаштаваць жураві-навых прысмакаў, набыць мясцовыя цікавосткі, пана-зіраць за шэрымі жураўлямі і паглядзець на таленавітых артыстаў. Трэба адзначыць, што па запасах журавін мяс-цовае балота Ельня займае першае месца ва ўсёй Бела-русі. Нездарма Мёры назы-ваюць журавінная сталіцай краіны. Фестываль «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю» ладзіцца кожны верасень з 2012 года.

Адмысловы прэс-тур для журналістаў адразу задаў высокую планку — навед-вальнікам выпала магчы-масць паназіраць за шэрымі жураўлямі. Убачыць ужывую чароды гэтых чырванакніж-ных птушак не так лёгка, бо яны звычайна пазбягаюць чалавека. Але нам давялося прасачыць за імі ў прафесій-ную оптыку.

— На Мёршчыне гняз-дуецца шмат жураўлёў, першыя прылятаюць ужо ў лютым. Яшчэ цікава, што птушкі днём харчуюцца на палях, а начуюць у забало-чаных месцах, таму што там больш бяспечна. У шэрых жураўлёў багаты рацыён: клубні, карэньчыкі, яшчар-кі, — распавёў **арнітолаг Віталь КАШЧЭЕЎ.**

Нашым экскурсаводам і падарожнікам была **тэма-тычны каардынатар па «зялёнай» інфраструктуры праекта міжнароднай тэх-нічнай дапамогі «Разам для грамады і прыроды: Мёрскі раён» Марына ГЕРНАТ.**

Некалькі гадоў таму, каб трапіць на мошчаную дош-камі сцежку па балоце, трэ-ба было пераадолець амаль кіламетр ляснай дарогі, та-му турысты заўсёды бралі з сабой гумовыя боты. Ця-пер там праклалі драўляную сцежку, па якой можна прай-сці і амаль не запэцкаць абу-так. Але боты лепш узяць, бо ў некаторых месцах можна хадзіць і па балоце. Адчуванні дзіўныя, быццам ступаеш па батуце!

— Многія думаюць, што балоты — гэта гразкія мес-цы, дзе абавязкова можна патануць, але балоты быва-юць розныя. Ёсць верхавыя і нізінныя. Тут балота верха-вое, у выглядзе нарастаючa-га купалу. Гэта 3-я стадыя фарміравання балота — уні-зе пласты торфу, таму нель-га праваліцца, — паведамі-ла Марына Гернат.

На экасцежцы сустрэлі шмат падарожнікаў і ар-ганізаваныя турыстычныя групы. На тэрыторыі заказ-ніка ёсць стэнды, дзе мож-на даведацца пра птушак, расліны, жывёл, якія тут сустракаюцца. Дзіўна, але факт — 1 кіламетр руху па балоце прыраўноўваецца да 5-7 кіламетраў па ас-фальце. У заказніку Ельня налічваецца 93 віды пту-шак, з якіх 23 — чырвана-кніжныя.

— Балота пакрыта мохам сфагнум, які мае здольнасць абеззаражваць, ваду на ба-лоце нават можна піць, — сказала Марына Гернат.

